Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЛЮТАГА 2023 г.
СЕРАДА
№ 20 (29900)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

...А РУКІ Ў ЛЮДЗЕЙ ЗАЛАТЫЯ! 4

СТЫМУЛ ПАТРЭБЕН УСІМ 5

КАРОТКА

- **ГЭС Беларусі ў 2022 годзе выпрацавалі больш за 370 млн кВт.г электраэнергіі.**
- Бразільская дэлегацыя зацікавілася беларускай трактарнай тэхнікай з рухавікамі ММЗ.
- **Беларуская гімнастка Аліна Гарнасько выйграла пяць залатых медалёў на турніры ў Іспаніі.**
- Прэм'ер-міністры краін ЕАЭС абмяркуюць падрыхтоўку праекта дагавора аб фарміраванні агульнага рынку газу.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ягор ЧАРНЯЎСКІ, начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічных сувязяў Міністэрства прамысловасці:

«Беларуская прамысловая прадукцыя карыстаецца вялікай папулярнасцю ў свеце. Кожны трэці кар'ерны самазвал — гэта БЕЛАЗ, кожны дзясяты трактар — BELARUS. Кампанія «Інтэграл» уваходзіць у дзясятку найбуйнейшых вытворцаў мікраэлектронных тэхналогій, нашы МАЗ і «Белкамунмаш» з'яўляюцца аднымі з найбуйнейшых вытворцаў пасажырскага транспарту на тэрыторыі блізкага замежжа. Але асабліва хацелася б падкрэсліць высокатэхналагічнасць і навукаёмістасць нашай прамысловай прадукцыі. Паводле даных за 11 месяцаў 2022 года, каля 75 працэнтаў прыпадае менавіта на навукаёмістую прадукцыю».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«НАМ, ШТО Б ТАМ НІ БЫЛО, ТРЭБА ПРАЙСЦІ ГЭТЫ СКЛАДАНЫ ПЕРЫЯД У ЖЫЦЦІ НАШАЙ ПЛАНЕТЫ»

Аб чым Аляксандр Лукашэнка гаварыў пасля перагавораў з кіраўніком Зімбабвэ

Учора Прэзідэнты Беларусі і Зімбабвэ Аляксандр Лукашэнка і Эмерсан Мнангагва правялі перагаворы ў Дзяржаўным Доме (Стэйт-Хаус) — афіцыйнай рэзідэнцыі зімбабвійскага лідара.

Фота БелТА.

Пасля завяршэння перагавораў у фармаце «адзін на адзін» бакі сустрэліся ў пашыраным складзе з удзелам членаў дэлегацый.

Потым адбылася цырымонія падпісання двухбаковых дакументаў. У прысутнасці кіраўнікоў дзяржаў былі падпісаны пагадненні аб заахвочванні і ўзаемнай абароне інвестыцый, аб стварэнні сумеснай пастаяннай камісіі па супрацоўніцтве. Заключаны мемарандум аб узаемаразуменні паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Зімбабвэ аб узаемным прызнанні дакументаў аб адукацыі. Таксама падпісана міжурадавае пагадненне аб прадухіленні двайнога падаткаабкладання і прадухіленні ўхілення ад выплаты падаткаў адносна падаткаў на даходы і маёмасць. Яшчэ адно пагадненне — аб устанаўленні пабрацімскіх адносін паміж гарадамі Мінск і Харарэ.

Па выніках перагавораў з Прэзідэнтам Зімбабвэ беларускі лідар адзначыў: «Мы падрабязна абмеркавалі перспектыўныя напрамкі супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, якое значна актывізавалася за апошнія гады».

Асабліва кіраўнік беларускай дзяржавы акцэнтаваў увагу на дамоўленасці па падрыхтоўцы спецыялістаў па ўсіх напрамках, якія цікавяць зімбабвійскі бок. Дамовіліся таксама аб рэалізацыі інвестыцыйных і кааперацыйных праектаў у розных сферах, што стане асновай для прадаўжэння супрацоўніцтва. «У галіне прамысловасці, гандлю, сельскай гаспадаркі, энергетыкі, транспарту і здабычы карысных выкапняў. Мы таксама дамовіліся, што гэтыя кантракты і нашы дамоўленасці, якіх мы сёння дасягнулі, стануць асновай для прадаўжэння нашага супрацоўніцтва», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Патэнцыял нашага ўзаемадзеяння вялікі, — дадаў Прэзідэнт. — І я ўпэўнены, рэгулярныя прамыя кантакты рознага ўзроўню дадуць магчымасць раскрыць яго як найлепш».

«Калі зімбабвійскаму боку будзе цікава стварэнне сумесных вытворчасцяў у Зімбабвэ і ў Беларусі, мы гатовы на гэта ісці. Атрымліваючы сыравіну з Зімбабвэ, мы будзем разам з вашымі спецыялістамі перапрацоўваць гэтую сыравіну на прадпрыемствах у Беларусі. І такім чынам дзяліць адпаведны прыбытак. Таксама мы вітаем уваходжанне зімбабвійскага капіталу ў капітал нашых прадпрыемстваў», — сказаў беларускі лідар.

«Вы павінны ведаць, што там, у цэнтры Еўропы, ёсць такая краіна — Беларусь, якая заўсёды гатова падставіць вам плячо ў любой сітуацыі, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы вынікі гэтага візіту пакладзём на шалі міру і прагрэсу».

СТАР. 2

Па сутнасці справы

БЫЦЬ З ЛЮДЗЬМІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Каб зразумець, куды рухаецца развіццё сацыяльнай абароны насельніцтва нашай краіны, дастаткова зазірнуць у Нацыянальную стратэгію ўстойлівага развіцця Беларусі да 2035 года, дзе тэзіс «чалавек — галоўная каштоўнасць» расшыфроўваецца, у тым ліку, праз дасягненне некалькіх мэт у названай сферы. Першая — забеспячэнне магчымасці актыўнага ўдзелу ў развіцці грамадства чалавека любога ўзросту. Другая — эфектыўнае выкарыстанне даступнай падтрымкі ў інтарэсах тых, хто ў ёй мае патрэбу. Трэцяя — людзі з інваліднасцю інтэграваныя ва ўсе аспекты жыццядзейнасці. Чацвёртая — змяншэнне долі грамадзян, схільных да рызыкі беднасці і сацыяльнай ізаляцыі. У праграмным дакуменце прапісаны прынцыпы (сацыяльная справядлівасць, адраснасць) і задачы сацыяльнай абароны — павышэнне якасці жыцця і ўзроўню сацыяльнага дабрабыту грамадзян, якім патрабуецца клопат грамадства. Але што стаіць за гэтымі фармулёўкамі, можна паглядзець ужо цяпер, калі бліжэй пазнаёміцца з работай сістэмы сацыяльнай абароны насельніцтва.

СТАР. 4-5

АПОШНЯЯ ЦЫГАРЭТА

Неасцярожнае абыходжанне з агнём пагражае сур'ёзнымі наступствамі

Летась у краіне адбылося 5958 пажараў, на якіх загінулі 627 чалавек. З пачатку гэтага года (па стане на 30 студзеня) супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях зафіксавалі 487 пажараў, вогненная стыхія забрала 66 жыццяў...

СТАР. 3

«НАМ, ШТО Б ТАМ НІ БЫЛО, ТРЭБА ПРАЙСЦІ ГЭТЫ СКЛАДАНЫ ПЕРЫЯД У ЖЫЦЦІ НАШАЙ ПЛАНЕТЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ён звярнуўся да жыхароў краіны, адзначыўшы, што сёння найбуйнейшыя дзяржавы планеты — уладныя людзі — спрабуюць падзяліць і перадзяліць гэты свет. Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу, што Зімбабвэ багатая на карысныя выкапні, а таму спакойнага жыцця гэтай краіне ніхто не дасць. І ў гэтым у тым ліку прычына санкцый. «Санкцыі амерыканцы ўвялі супраць вас не таму, што вы не дэмакратычныя. А таму, што вы вырашылі ўзяць пад кантроль сваю краіну і карысныя выкапні. Вы не пускаеце сюды рознага роду міжнародных прайдзісветаў і жулікаў, каб яны карысталіся вашымі нетрамі. У гэтым прычына санкцый. Вас зноў, як гэта было ў мінулыя стагоддзі, хочуць паставіць на калені. А Прэзідэнт і ўлада Зімбабвэ гэтага не хочуць. Вось адсюль санкцыі», — сказаў ён. «Вас будуць узмоцнена разгойдваць, каб пасеяць смуту ў вашым грамадстве, вас будуць ставіць на калені. Але вы павінны вытрымаць. І вы вытрымаеце, калі будзеце адзіныя, калі не дапусціце ўнутры краіны сутыкненні ўласнага народа з-за нейкіх палітычных амбіцый або ілюзорных абяцанняў Захаду і Амерыкі, — падкрэсліў беларускі лідар. — Нам, што б там ні было, трэба прайсці гэты складаны перыяд у жыцці нашай планеты. Беражыце мір! Не здолееце гэта зрабіць — зноў траціце пад каланіяльны прыгнёт». Прамова Аляксандра Лукашэнкі неаднаразова суправаджалася апладысментамі.

Каравай, які трымаюць зімбабвійскія дзяўчаты ў беларускіх нацыянальных касцюмах, быў выпечаны з ураджаю, сабранага з дапамогай нашай тэхнікі.

Гэтыя «Беларусы» гатовыя для работы на афрыканскіх палях.

«Афрыка даўно прачнулася. Без Афрыкі не можа быць перспектывы ў свеце наогул. Без Афрыкі свет развівацца не можа. Будучыня за Афрыкай», — упэўнены Прэзідэнт Беларусі.

Ён адзначыў, што ў рамках пачатай у 2020 годзе праграмы па механізацыі ў фермерскія гаспадаркі Зімбабвэ беларускі бок паставіў больш як 1,8 тысячы трактароў і каля 80 збожжаўборачных камбайнаў. Гэта тэхніка дапамагла гарантаваць харчовую бяспеку краіны. «Але гэта толькі пачатак. Мы далі старт трэцяй фазе гэтай праграмы на суму звыш $66 млн. Яна прадугледжвае больш як 3,7 тысячы адзінак трактарнай тэхнікі, 60 камбайнаў для мясцовых аграрыяў на працягу найбліжэйшых паўтара года», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, для патрэб мясцовых муніцыпалітэтаў у Зімбабвэ пачаты пастаўкі пажарных аўтамабіляў беларускай вытворчасці. Акрамя таго, у Зімбабвэ ўжо паспяхова эксплуатуецца кар'ерная тэхніка БелАЗ. У найбліжэйшы час плануецца паставіць яшчэ больш за 30 самазвалаў. Пры гэтым, адзначыў Аляксандр Лукашэнка, у Зімбабвэ забяспечваецца і сэрвіснае абслугоўванне беларускай тэхнікі.

На перагаворах з Прэзідэнтам Зімбабвэ Эмерсанам Мнангагвай былі ў тым ліку абмеркаваны перспектывы развіцця супрацоўніцтва з Мазамбікам і тое, як можна перанесці напрацаваны з зімбабвійскім бокам вопыт на гэту краіну. Кіраўнік беларускай дзяржавы растлумачыў, што ў Эмерсана Мнангагвы добрыя адносіны з кіраўніцтвам Мазамбіка і ён можа аказаць садзейнічанне ў гэтым пытанні.

Эмерсан Мнангагва ў час размовы з журналістамі па выніках перагавораў падкрэсліў: «Гэты візіт умацоўвае, пашырае і кансалідуе нашы двухбаковыя адносіны». Ён адзначыў, што Беларусь аказвае вялікую падтрымку ў механізацыі сельскай гаспадаркі Зімбабвэ, развіваецца супрацоўніцтва і ў іншых сферах.

Учора з удзелам кіраўнікоў дзяржаў адбылася цырымонія перадачы беларускай тэхнікі. Тут ім коратка далажылі аб рабоце па пастаўках і абслугоўванні беларускай тэхнікі ў Зімбабвэ.

Прэзідэнтаў сустракалі зімбабвійскія дзяўчаты ў беларускіх нацыянальных касцюмах з караваем у руках. Ён быў выпечаны з мясцовага ўраджаю, сабранага з дапамогай беларускай тэхнікі.

У сваім выступленні на цырымоніі Прэзідэнт Беларусі сказаў: «Хачу падзякаваць амерыканцам і ўсяму заходняму свету за тое, што яны ўвялі супраць нас санкцыі. У адваротным выпадку на гэтым вялікім полі стаялі б не беларускія трактары, а амерыканскія і нямецкія», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Вы павінны памятаць: нас падзяляюць немалыя адлегласці, але мы гатовы заўсёды дапамагаць вам, мы гатовы прыняць вашу дапамогу. Мы гатовы вам падставіць плячо ў любы час, у любым месцы, вырашаючы самыя складаныя праблемы і задачы», — запэўніў беларускі лідар. Ён заклікаў народ Зімбабвэ захоўваць адзінства і пажадаў усім шчасця, міру і дабра, а таксама хлеба на сталах.

Аляксандр Лукашэнка падарыў калегу трактар для яго асабістай падсобнай гаспадаркі. У сваю чаргу Эмерсан Мнангагва падарыў Прэзідэнту Беларусі чучала льва — цара звяроў і адной з самых моцных жывёл у Афрыцы.

Паводле БелТА.

Інавацыі

«І гэта ўсё зрабілі МЫ!»...

...так эмацыянальна ахарактарызавала ўбачанае на выстаўцы «Беларусь інтэлектуальная» адна з яе наведвальніц

— Мне здаецца, што гэта самае важнае меркаванне. Нам удалося даказаць і паказаць усім, што Беларусь — насамрэч інтэлектуальная краіна, — падкрэслівае першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей ЧЫЖЫК. — Ідэя з арганізацыяй і правядзеннем такой выстаўкі была выстралам у «дзясятку».

Літаральна пасля першых дзён мы пачулі меркаванне, што трэба работу выстаўкі прадоўжыць, што і было зроблена. І гэта вельмі правільнае рашэнне. Мы ж бачылі, колькі наведвальнікаў на выстаўцы штодня. Прыходзілі як групы школьнікаў і студэнтаў, так і звычайныя сем'і. Людзям цікава, яны ўнікалі ва ўсе нюансы, задавалі шмат пытанняў. Атрымаўся сапраўдны дыялог. Паводле прыблізных ацэнак, выстаўку за дзевяць дзён наведалі ад 80 да 100 тысяч чалавек. Поўнамаштабна на ёй былі прадстаўлены дасягненні фізікаў і матэрыялазнаўцаў. Прычым усё было прэзентавана вельмі даходліва і наглядна. Увогуле, кластарная арганізацыя экспазіцыі, калі навуковыя распрацоўкі былі сабраны па тэмах, незалежна ад прыналежнасці навуковай арганізацыі да пэўнага ведамства, цалкам сябе апраўдала. Немалаважна, што, калі было прынята рашэнне прадоўжыць выстаўку, яе экспазіцыя дадаткова папаўнялася новымі распрацоўкамі. Усе сталі думаць: а што яшчэ можна прадставіць увазе грамадскасці, чым захапіць і здзівіць?..

«Выстаўка «Беларусь інтэлектуальная» паказала, што наша краіна знаходзіцца на высокім інтэлектуальным узроўні, мы ідзём у нагу з часам, у нас ёсць інавацыйныя распрацоўкі, часам нават такія, якіх няма ў нашых суседзяў. Наведвальнікі змаглі азнаёміцца з шырокім блокам медыцынскіх тэхналогій, прычым не ніжэй чым пяты-шосты тэхналагічны ўклад, — падкрэслівае, падводзячы вынікі навукова-папулярнага мерапрыемства, **начальнік аддзела навукі Міністэрства аховы здароўя Маргарыта ДОСІНА.** — Тыя ж клетачныя тэхналогіі, якія мы актыўна прымяняем для лячэння розных захворванняў, знаходзяцца на ўзроўні шостага тэхналагічнага ўкладу. Яны працуюць там, дзе не можа справіцца традыцыйная медыцына. Медыцынская навука ўвогуле з'яўляецца самай практыка-арыентаванай, таму што медыкі працуюць з пацыентамі, ім трэба прымаць хуткія рашэнні тут і цяпер. Канешне, паколькі нашы перадавыя тэхналогіі знаходзяцца каля ложка пацыента, мы не можам іх так наглядна прадэманстраваць, як тыя ж фізікі. Але мы спрабавалі гэта рабіць. Спадзяюся, у нас атрымлівалася».

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Да найбольш значных дасягненняў, прадстаўленых на выстаўцы, на думку Маргарыты Досінай, трэба аднесці ДНК-вакцыну супраць нейрабластомы. На гэта захворванне пакутуюць дзеці да двух гадоў. Вакцына дапамагае ў тых выпадках, калі не дапамагае традыцыйнае прымяненне лекавых сродкаў. Шасцёра дзяцей ужо прайшлі ДНК-вакцынацыю.

— Выстаўка «Беларусь інтэлектуальная» садзейнічае папулярызацыі навукі сярод моладзі і іх прафарыентацыі, — дзеліцца сваім меркаваннем начальнік упраўлення **навукі і інавацыйнай дзейнасці Міністэрства адукацыі Пётр ПЯКУЦЬКА.** — Мерапрыемства выконвае мноства функцый. Перш за ўсё пазнавальную і прамоўтарскую, маркетынгавую. Дзякуючы гэтай выстаўцы мы змаглі сфарміраваць у значнай колькасці нашых грамадзян уяўленне аб беларускай навуцы. Былі паказаны канкрэтныя вынікі работы вучоных. Такія выстаўкі неабходныя, каб у грамадстве статус вучонага заўсёды знаходзіўся на высокім узроўні.

На яго думку, выстаўка ў тым ліку вырашае і задачы прафарыентацыі. Паводле звестак Міністэрства адукацыі, яе наведалі каля 6,5 тысячы студэнтаў, каля 3 тысяч школьнікаў і каля 2,5 тысячы навучэнцаў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Яны не толькі даведаліся аб новых беларускіх распрацоўках, але і паглядзелі, кім яны ў будучым могуць стаць, чым займацца або зацвердзіліся ў сваім прафесійным выбары.

Выстаўка «Беларусь інтэлектуальная» за два месяцы аб'едзе ўсе абласныя цэнтры. Па словах Сяргея Чыжыка, першым яе прыме Гомель. Адметнасцю выставак, якія пройдуць у абласных цэнтрах, стане асобная экспазіцыя, прысвечаная развіццю і дасягненням навукі ў канкрэтным рэгіёне.

Таксама хутка выстаўку «Беларусь інтэлектуальная» можна будзе наведаць у віртуальным фармаце. «Экспазіцыю, прадстаўленую ў Мінску, мы знялі. Калі будзе зроблена віртуальная версія, выставім яе ў інтэрнэце. Людзі змогуць яшчэ доўга наведваць выстаўку з пачуццём рэальнай прысутнасці, разглядаць экспанаты, чытаць інфармацыю аб іх. Спадзяёмся, у найбліжэйшы час мы зможам даць усім такую магчымасць», — паведаміў Сяргей Чыжык.

Надзея НІКАЛАЕВА.

АПОШНЯЯ ЦЫГАРЭТА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Многіх трагедый можна было б пазбегнуць, калі б людзі не ігнаравалі звычайныя правілы бяспекі. У прыватнасці, не забываліся патушыць цыгарэту або ўвогуле не курылі ў памяшканні. На жаль, неасцярожнае абыходжанне з агнём падчас курэння — адна з найбольш частых прычын пажараў, якія заканчваюцца гібеллю людзей. Калі ж чалавек пры гэтым яшчэ знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення, наўрад ці можна разлічваць на спрыяльны зыход падзей.

Дапамога прыйшла своечасова

Па папярэдняй інфармацыі, менавіта непатушаная цыгарэта стала прычынай пажару ў адной з кватэр у шматпавярховіку Наваполацка ў нядзелю. Паведамленне аб узгаранні ратавальнікам паступіла пасля дзесяці раніцы — супрацоўнікі МНС неадкладна выехалі на месца здарэння.

Калі прыбылі па ўказаным адрасе, з акна на другім паверсе пяціпавярховага дома на ўсю моц ішоў дым. «Адкрытага гарэння не было відаць, — расказвае **ратавальнік Уладзімір МАЖЭЙКА.** — Увайшоўшы ў пад'езд і падняўшыся на патрэбны паверх, я ў складзе звяна газадымаахоўнай службы ўвайшоў у памяшканне. У кватэры быў захламлены праход, нам прыйшлося яго расчышчаць, каб прайсці. Далей, выявіўшы агач узгарання, мы адразу ж прыступілі да тушэння і адначасовага пошуку пацярпелых. Пры абследаванні некалькіх пакояў нічога не выявілі, але, зайшоўшы на кухню, у дыме я ўбачыў жанчыну, якая ляжала на падлозе без прытомнасці. Разам з таварышам Артурам Юшчанкам мы вынеслі яе ў пад'езд і перадалі калегам, якія на вуліцы перадалі пацярпелую брыгадзе хуткай дапамогі. У гэты час мы працягнулі абследаванне вышэйшых паверхаў».

Выратаваная жанчына 1966 года нараджэння пасля агляду была шпіталізавана ў бальніцу з апёкамі рознай ступені цяжкасці і атручэннем прадуктамі гарэння. Як распавёў ратавальнік Максім Баравіцкі, у кватэры на трэцім паверсе, якая размяшчалася над той, дзе адбылося ўзгаранне, было шмат дыму. У ёй супрацоўнік МНС выявіў чатыры чалавекі, у тым ліку дзіця 2017 года нараджэння. Усе былі выведзены на свежае паветра. Пасля агляду медыкамі пацярпелых адпусцілі дадому. У выніку пажару ў кватэры, дзе адбылося ўзгаранне, былі пашкоджаны канапа і пасцельныя рэчы, закураны сцены і столь.

Наступствы нядаўняга пажару ў Наваполацку.

У панядзелак падраздзяленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях тушылі пажар у Клецку. Да прыбыцця ратавальнікаў на дапамогу пацярпелым паспяшаўся неабыякавы прахожы, які ўбачыў узгаранне ў жылым доме. Мужчына выцягнуў з задымленай кватэры сына гаспадыні 2003 года нараджэння.

— Праязджаючы на машыне, я ўбачыў дым, — расказаў Сяргей Дамашэвіч, — і накіраваўся туды. У акне на першым паверсе заўважыў маладога хлопца, ён махаў рукамі. Я дастаў яго праз акно, апусціў на зямлю. Ужо чулася сірэна пажарных машын.

Як заўважыў **намеснік начальніка Клецкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Алег ГРУША,** пасля прыбыцця падраздзяленняў хлопец ужо знаходзіўся на вуліцы. «Ратавальнікі аднеслі яго ў пажарную машыну, ён быў лёгка апрануты, — звярнуў увагу супрацоўнік МНС. — Калі прыбыла хуткая дапамога, маладога чалавека перанеслі ў машыну медыкаў».

Пажар быў ліквідаваны. Эвакуацыя жыхароў дома не спатрэбілася. З папярэднім дыягназам «атручэнне прадуктамі гарэння» брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі пацярпелы быў дастаўлены ў Клецкую ЦРБ. Прычына пажару высвятляецца.

Пазбегнуць пажару

Начны пажар у Смаргоні, які адбыўся ў ноч на 22 студзеня, забраў жыцці чатырох чалавек. Паведамленне аб тым, што па вуліцы Чырвонаармейскай у райцэнтры гарыць прыватны жылы дом, паступіла дыспетчару службы «101» Смаргонскага раёна. Мясцовая жыхарка паведаміла, што з будынка выбіваюцца клубы дыму, а ўнутры могуць знаходзіцца людзі.

Ужо праз пяць хвілін пасля паведамлення першыя аддзяленні пажарных прыбылі да месца здарэння. «Драйляны будынак гарэў знутры, полымя выбівалася на дах, — згадаў дэталі той ночы **старшы інструктар-ратавальнік Дзмітрый СІЛЬВАНОВІЧ.** — Да нашага прыбыцця мясцовы жыхар увайшоў у дом і вынес на вуліцу жанчыну ў беспрытомным стане. Брыгада хуткай дапамогі шпіталізавала яе ў цэнтральную раённую бальніцу.

Уключыўшыся ў апараты на сціснутым паветры, работнікі МНС пачалі тушэнне пажару і пошук людзей унутры будынка. Пры правядзенні разведкі ў адным з пакояў знайшлі 37-гадовую жанчыну, 36-гадовага гаспадара дома, дваіх мужчын 38 і 37 гадоў. Усе — без прыкмет жыцця. Устанаўленнем прычыны і абставін трагедыі займаюцца супрацоўнікі Следчага камітэта. Спецыялісты сцвярджаюць, што хутчэй за ўсё да бяды прывяло курэнне.

Менавіта з-за гэтай згубнай звычкі не ўдалося пазбегнуць эвакуацыі жыхароў аднаго са шматпавярховікаў у Віцебску. «Ужо пад'язджаючы да месца паведамлення, мы ўбачылі клубы дыму, якія ішлі з-за дома, — распавёў **ратавальнік Ягор СЦЯПАНАЎ.** — Каля ўваходу ў пад'езд тоўпіліся відавочцы, з балкона другога паверха пяціпавярхоўкі ішоў чорны дым. Разам з таварышамі Дзянісам Халаньковым і Уладзіславам Казлоўскім мы зайшлі ў пад'езд. Бачнасць была мінімальная, усё зацягнута дымам. Дзверы ў кватэру аказаліся не замкнутыя. Мы ўвайшлі ўнутр, у калідоры на падлозе адразу знайшлі жанчыну. Яна была ў прытомнасці, але паводзіла сябе неадэкватна. Мы ўзялі яе на рукі і вынеслі ў пад'езд. Адразу вярнуліся назад і ў дальнім пакоі, дзе ўжо на ўсю моц гарэў ложак і маёмасць, на падлозе знайшлі двух мужчын — абодва былі без прытомнасці. Мы вынеслі іх з кватэры. Аднаго перадалі ратавальнікам медыцынскай службы атрада «Віцязь». Алена Міхальчанка да прыезду «хуткай» аказвала мужчыну першую дапамогу. Вынесшы другога мужчыну, стала зразумела, што ён загінуў».

У той час, як супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях спраўляліся з узгараннем і аказвалі дапамогу пацярпелым, у цэнтр аператыўнага ўпраўлення МНС Віцебска патэлефанавала жанчына з трэцяга паверха гэтага ж дома. Яна сказала, што ў яе кватэры шмат дыму, выйсці самастойна яна не можа, усе лесвіцы таксама ў дыме. Адразу ж у кватэру накіраваліся ратавальнікі і вывелі жанчыну на свежае паветра. З атручэннем прадуктамі гарэння яе шпіталізавалі ў бальніцу.

Ратавальнікі працягвалі разведку на вышэйшых паверхах. З іх былі эвакуіраваны яшчэ 13 чалавек, у тым ліку трое дзяцей. Як стала вядома з абставін праверкі, гаспадыня кватэры, у якой адбыўся пажар, памерла летась. У кватэры застаўся пражываць яе сын, труп якога і знайшлі ратавальнікі на месцы пажару. Мужчына нідзе не працаваў, злоўжываў спіртным. Напярэдадні пажару ў яго ў гасцях знаходзіліся знаёмыя мужчына і жанчына — абодва беспрацоўныя. Іх пазней шпіталізавалі ў бальніцу з атручэннем прадуктамі гарэння. Прычынай пажару, як і ў большасці выпадкаў з гібеллю людзей, стала неасцярожнасць з агнём падчас курэння.

— Большасць тых, хто ў мінулым годзе загінуў на пажарах, знаходзілася ў стане алкагольнага ап'янення, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — У сувязі з гэтым хочацца парэкамендаваць людзям, якія не могуць адмовіцца ад згубнай прыхільнасці курыць дома, рабіць гэта з выкананнем правілаў бяспекі. Каб пазбегнуць трагедыі, катэгарычна забараняецца кідаць непатушаныя цыгарэты на падлогу, недапушчальна курыць у ложку. Недакуркі варта складаць у попельніцу або металічную пасудзіну — пажадана напоўненую вадой. Пераканайцеся ў тым, што патушаная цыгарэта не толькі не гарыць, але і не тлее. Не стварайце небяспеку сабе і тым, хто жыве побач з вамі. Своечасова выявіць узгаранне і, адпаведна, пазбегнуць пажару, дапаможа аўтаномны пажарны апавяшчальнік.

Цвярозы погляд

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях праводзіць акцыю «Бяспека — у кожны дом!», якая накіравана на папярэджанне пажараў і гібелі людзей ад іх. На першым этапе акцыі ў цэнтры ўвагі ратавальнікаў былі асобы, якія злоўжываюць алкаголем і вядуць асацыяльны лад жыцця. Адпаведныя прафілактычныя мерапрыемствы прайшлі ў аддзяленнях дзённага знаходжання наркадыспансераў, цэнтрах бяспекі, апорных пунктах грамадскага правапарадку і пунктах прыёму другаснай сыравіны. Пад дэвізам «цвярозы погляд на бяспеку» свае намаганні ў папярэджанні пажараў аб'ядналі ратавальнікі, прадстаўнікі Чырвонага Крыжа, органаў унутраных спраў, духавенства, ветэраны МНС і добраахвотнікі.

На другім этапе ўвага арганізатараў акцыі скіравана на састарэлых грамадзян з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, жыхароў сельскіх населеных пунктаў, студэнтаў, а таксама навучэнцаў выпускных класаў школ. Як для моладзі, так і для старэйшага пакалення, падрыхтавана нямала цікавых тэматычных гутарак, конкурсаў, квэстаў, у тым ліку будзе арганізавана работа інтэрактыўных пляцовак. Не пакінуць без увагі і наведвальнікаў тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання.

На фінальным этапе акцыі, які пройдзе 9 і 10 лютага, ратавальнікі разгорнуць інтэрактыўныя пляцоўкі ў месцах масавага знаходжання людзей, а таксама падрыхтуюць канцэртную праграму. Падчас акцыі будуць задзейнічаны магчымасці работы ў анлайн-фармаце праз сацыяльныя сеткі і месенджары: заняткі, лекцыі праз інтэрнэт, адрасная рассыланне буклетаў і бяспечнай карэспандэнцыі, а таксама тэлефонныя зносіны ў фармаце «На сувязі ратавальнікі...» для людзей з абмежаваным кантактам — адным словам, усё дзеля таго, каб надзвычайных сітуацый стала як мага менш, а лепш — каб іх увогуле не было.

Вераніка КАНЮТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Сёлета палова росту сусветнага ВУП будзе прыпадаць на Індыю і Кітай

Пра гэта гаворыцца ў дакладзе дырэктара Даследчага дэпартамента МВФ П'ер-Аліўе Гурынша, апублікаваным на сайце фонду. Згодна са студзеньскім прагнозам, ВУП Кітая сёлета вырасце на 5,2 працэнта. Гэтаму будзе садзейнічаць зняцце каранційных мер, уведзеных раней на фоне пандэміі каранавіруса. Таксама чакаецца, што ВУП Індыі ўзрасце на 6,1 працэнта. «На Індыю і Кітай у гэтым годзе ўвогуле будзе прыпадаць палова сусветнага эканамічнага росту, у той час як на ЗША і еўразону ў сукупнасці — толькі 10 працэнтаў», — адзначаецца ў дакладзе. ВУП ЗША сёлета ўзрасце толькі на 1,4 працэнта, ВУП еўразоны — на 0,7 працэнта. Пры гэтым эканоміка Германіі, якая лічыцца найбуйнейшай у Еўропе, прадэманструе рост усяго 0,1 працэнта. Для параўнання: летась ВУП гэтай краіны ўзрос на 1,9 працэнта. Вялікабрытанію сёлета замест росту чакае скарачэнне эканомікі, якое складзе 0,6 працэнта. У цэлым, паводле даных Гурынша, дзевяць з дзесяці краін з развітой эканомікай сутыкнуцца са скарачэннем тэмпаў эканамічнага росту.

Дзесяць чалавек загінулі падчас перастрэлкі ў Калумбіі

Як мінімум адзін ваенны і дзевяць членаў паўстанцкай групоўкі «Армія нацыянальнага вызвалення» (АНВ) загінулі ў выніку сутыкнення ў захадзе Калумбіі. Пра гэта паведамілі Ваенна-марскія сілы краіны ў Twitter, перадала ТАСС. Перастрэлка адбылася ў лагеры АНВ, які знайшлі вайскоўцы ў муніцыпалітэце Буэнавентура. На месцы былі выяўленыя некалькі адзінак зброі. Як вядома, у канцы мінулага года прэзідэнт Калумбіі Густава Петра заявіў аб дасягненні пагаднення аб спыненні агню на паўгода з пяццю групоўкамі, у тым ліку АНВ. Пазней паўстанцы заявілі, што не заключалі дагавароў з урадам аб працяглым спыненні агню. У адказ улады Калумбіі прыпынілі дзеянне ўказа аб перамір'і з АНВ. «Армія нацыянальнага вызвалення», якая налічвае некалькі тысяч чалавек, засталася адзінай буйной паўстанцкай групоўкай у Калумбіі пасля таго, як у 2016 годзе ўрад заключыў пагадненне аб міры з арганізацыяй «Рэвалюцыйныя ўзброеныя сілы Калумбіі». Гэты дакумент паклаў канец канфлікту, які працягваўся больш за паўстагоддзя і ў выніку якога загінулі звыш 250 тысяч чалавек

Вялікабрытанія штогод страчвае $124 млрд у сувязі з выхадам з ЕС

Выхад Вялікабрытаніі са складу Еўрасаюза (Brexit) абыходзіцца штогод эканоміцы краіны ў €100 млрд ($124 млрд) з-за недаатрыманых інвестыцый, страты кадраў і прыбыткаў ад гандлю. Аб гэтым паведаміла агенцтва Bloomberg. Паводле яго звестак, памер брытанскага ВУП па выніках мінулага года быў бы на чатыры працэнты большы, калі б краіна не пакінула Еўрасаюз. Каралеўства таксама страціла каля 370 тысяч работнікаў з краін Еўрасаюза. «Ці нашкодзіла сабе Вялікабрытанія, калі прагаласавала за выхад з ЕС у 2016 годзе? Існуючыя на сёння даныя сведчаць аб тым, што гэта так», — адзначылі эканамісты Ана Андрадзэ і Дэн Хэнсан.

Сталіца

ЖЫЦЦЁ ВАРТАЕ ТАГО, КАБ ПРАЖЫВАЦЬ ЯГО З РАДАСЦЮ

Калі ўзнікаюць цяжкасці, дапамогу можна знайсці

Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна горада Мінска адкрыты з 1999 года. У сферы яго ўвагі другі па велічыні сталічны раён з насельніцтвам каля 310 тысяч чалавек. Падапечныя цэнтра — тыя, хто аказаўся ў складанай жыццёвай сітуацыі, а таксама пенсіянеры, шматдзетныя, адзінокія пажылыя грамадзяне, тыя, хто адасоблена пражывае, інваліды, асобы з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў ад 18 да 23 гадоў, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, асобы, якія пацярпелі ад наступстваў войнаў. Тут функцыянуе восем аддзяленняў, сектар па рабоце з недзеяздольнымі грамадзянамі і праект, у рамках якога аказваецца бясплатная прававая дапамога сацыяльна неабароненым грамадзянам.

— Каля 40 тысяч чалавек — гэта тыя, хто да нас звярнуўся па дапамогу, атрымаў яе, з кім мы застаёмся на сувязі і тыя, пра каго мы даведаліся, што яны маюць патрэбу ў дапамозе, — расказала «Звяздзе» **дырэктар ТЦСАН Маскоўскага раёна Мінска Наталля ЖАРЫКАВА.** — Даведваемся пра такіх ад іх сваякоў, суседзяў, супрацоўнікаў міліцыі, паліклінікі, разлікова-даведачнага цэнтра, пошты. У нас ёсць алгарытм узаемадзеяння з пэўнымі суб'ектамі прафілактыкі, якія па абстаноўцы ў кватэры, стане чалавека, ступені яго мабільнасці, наяўнасці ў яго сацыяльных сувязяў бачаць, што ён мае патрэбу ў сацыяльнай абароне. Мы збіраем інфармацыю і глядзім, якую дапамогу можам аказаць гэтаму чалавеку або сям'і, зыходзячы з яго даходу, фізічнага, маральнага стану.

Часта размова ідзе пра комплексную дапамогу: акрамя матэрыяльнай, чалавек мае патрэбу ў паслугах сацыяльнага работніка, сядзелкі, нянькі. Садзейнічаем у афармленні дакументаў для размяшчэння ў дамы-інтэрнаты.

Бясплатна аказваем сацыяльную дапамогу дома адзінокім пажылым грамадзянам, у тым ліку сямейным парам, інвалідам I і II груп, якія не маюць працаздольных членаў сям'і, абавязаных іх утрымліваць, калі памер іх пенсіі не вышэй бюджэту пражытачнага мінімуму. Калі вышэй, то аплата можа быць частковай або поўнай. Нашы паслугі недарагія, напрыклад, амаль двухгадзінны візіт сацыяльнага работніка каштуе на сёння адзін рубель 38 капеек. Ёсць пералік дадатковых сацыяльных паслуг, там кошт іншы, але такіх менш. У пералік абавязковых уваходзіць 75 паслуг, дадатковых — 30. Сярод апошніх — прыгатаванне складаных страў, клопат аб хатніх жывёлах, мыццё плафонаў, прыбіранне ў шафах, дробны рамонт адзення.

Забяспечваем тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, а калі чалавек набыў такія сродкі самастойна — кампенсуем іх кошт. Для інвалідаў I групы кампенсуем кошт падгузкаў.

Займаемся прызначэннем і распараджэннем сямейнага капіталу для шматдзетных сем'яў, выдаём ім пасведчанні, інфармуем пра льготы. Дапамагаем аформіць матэрыяльную дапамогу. Курыруем недзеяздольных паўналетніх людзей, якія пражываюць самастойна. У нас такіх каля 500 чалавек. Прызначаем ім апекуноў, каб падтрымліваць узровень іх жыцця.

— У якіх выпадках чалавек, які мае патрэбу ў дапамозе, можа застацца без клопату тэрытарыяльнага цэнтра?

— Калі сам свядома адмаўляецца. Ён мае на гэта права. Нехта прызвычаіўся да свайго ладу жыцця, жыве ў сваёй кватэры, не хоча нікуды пераязджаць і нікога да сябе пускаць. Нават, калі не можа перасоўвацца. Прадукты прыносяць суседзі, і гэтага чалавеку дастаткова. Тым не менш, мы настойліва рэкамендуем скарыстацца магчымасцямі, якія маюцца ў нашай дзяржаве. Тлумачым, інфармуем, што сацыяльны работнік паклапоціцца, каб падапечны быў накормлены, апрануты, каб яго кватэра была чыстай, каб, нарэшце, мог пагутарыць.

У нас ёсць аддзяленне, задача якога падтрымліваць сацыяльныя стасункі, мабільнасць і актыўнасць пажылых людзей. Навучаем карыстацца смартфонам, камп'ютарам, інтэрнэтам, заказваць тавары з дастаўкай. Навучаем гэтаму і дома. Пенсіянеры прыходзяць у наша аддзяленне, каб патанцаваць, паспяваць, паразмаўляць адно з адным. У нас такіх каля 200 чалавек. Ёсць гурткі платныя і бясплатныя.

Працуем з людзьмі, якія маюць асаблівасці па зроку і слыху. У штаце ёсць тры перакладчыкі жэставай мовы, ладзім з імі выязныя мерапрыемствы, канцэрты.

Маем два філіялы аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў. У адным навучаем падапечных (як правіла, гэта выпускнікі цэнтраў карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі) навыкам пярвічнага самаабслугоўвання, гатавання, шыцця, а таксама рабоце ў майстэрнях. У другім забяспечваем догляд інвалідаў, каб на некалькі гадзін разгрузіць іх бацькоў або законных прадстаўнікоў.

Два гады таму адкрылі яшчэ адно аддзяленне, і яно пакуль адзінае ў Мінску — так званыя трэніровачныя кватэры для набыцця навыкаў аўтаномнага пражывання маладымі інвалідамі. Яно было адкрыта пры падтрымцы раённай структуры Мінскай гарадской арганізацыі Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам (БелАДДІМІ) і Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама. Разлічана на адначасовае знаходжанне васьмі чалавек. Курс навучання — тры месяцы. Задача — пазбегнуць патрэбы змяшчаць гэтых маладых людзей у інтэрнат. Яны навучаюцца арыентавацца ў горадзе, распараджацца фінансамі, абараняць сябе ад гвалту. Каб уключыць у гэты працэс іх родных, стварылі бацькоўскі клуб.

Цяпер вядзём работу па адкрыцці аддзялення для людзей з дэменцыяй. Пакуль даглядаем такіх дома. Плануем таксама разам з нямецкімі партнёрамі рэалізаваць сумесны праект па навучанні догляду ляжачых хворых. Яшчэ адзін праект, які ў распрацоўцы, — інклюзіўны спорт. Размова пра вулічныя трэнажоры для інвалідаў. У планах на гэты год — вывесці на новы ўзровень індывідуальную работу з інвалідамі менавіта ў сферы спартыўных заняткаў. Збіраемся адкрыць спартзалу. Гэта вельмі перспектыўны кірунак.

Увогуле наш цэнтр аказвае масу паслуг самага шырокага спектра. Сярод новых — паслугі нянькі для дзяцей з трох да шасці гадоў у шматдзетных сем'ях, а таксама для дзяцей-інвалідаў да дасягнення імі 18 гадоў. Працуем з людзьмі, якія аказаліся ахвярамі гвалту, з асобамі з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў ад 18 да 23 гадоў. На базе нашага цэнтра працуюць групы ананімных алкаголікаў, ананімных наркаманаў. Супрацоўнічаем з Праваслаўнай царквой, Фондам ААН у сферы народанасельніцтва, разам грамадскімі арганізацыямі рэалізуем міжнародныя гуманітарныя праекты.

— Колькі людзей працуе ў цэнтры?

— Каля 200 чалавек. Большасць з іх аказвае непасрэдную сацыяльную дапамогу.

— Што павінен ведаць пра тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання любы чалавек?

— Кожны, хто аказаўся ў сітуацыі, у якой не ведае што рабіць, незалежна ад узросту, стану здароўя, сямейнага альбо сацыяльнага статусу, можа звярнуцца да нас. Самае меншае — мы накіруем па адрасе, дзе змогуць дапамагчы, калі гэта не ў нашых сілах. Але многія праблемы — ад матэрыяльных да псіхалагічных — мы дапамагаем вырашаць. Пажылым людзям не варта саромецца страты тых або іншых фізічных магчымасцяў, не трэба замыкацца. Жыццё вартае таго, каб пражываць яго з радасцю. Часам дастаткова бывае добрага слова, якое вы заўсёды пачуеце ў тэрытарыяльным цэнтры.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Нясумны занятак

САД З МЯДОВЫМ ПАХАМ

У Расцянскім доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў Чавускага раёна ствараюць творы мастацтва і развіваюць пчалярства

Напрыканцы мінулага года ў Прэзідэнцкай бібліятэцы Дома ўрада і Рэзідэнцыі Прэзідэнта была арганізаваная незвычайная выстава. На сценах яе з'явіліся творы зусім не славутых аўтараў, а выхаванцаў Расцянскага дома-інтэрната. І краналі яны не менш, чым работы вядомых майстроў. Выстава, дарэчы, так і называлася — «Мы дорым святло сваёй душы».

— Не паверыце, але некаторыя людзі нават адчувалі фізічнае ўздзеянне гэтых работ, — расказвае **дырэктар установы Алена СЯМЁНАВА.** — Наш Аляксандр Лебедзеў выпальвае па дрэве. У яго задумка — зрабіць калекцыю работ усіх храмаў Магілёўскай епархіі. Пакуль у яго толькі сем. Падчас выставы яны былі вывешаны ў калідоры бібліятэкі. Супрацоўнікі і наведвальнікі неаднойчы казалі, што быццам адчуваюць пах ладану. І гэта пры тым, што яго там і блізка няма.

Наогул, у доме-інтэрнаце шмат талентаў. Напрыклад, у Маргарыты Казіміраўскай атрымліваюцца выдатныя малюнкі ў стылі графікі. Педагог параіла ёй папрацаваць у тэхніцы «дудлінг», і жанчына захапілася. З-пад яе рукі выходзяць на дзіва цікавыя формы. Яна нават удасканаліла занятак, уплятае ва ўзор беларускі арнамент. Работы атрымліваюцца эксклюзіўныя.

А Аляксандра Касцяна ў доме-інтэрнаце называюць не інакш, як Ляўша. Аляксандр — калясачнік, але ў яго сапраўды залатыя рукі. Ён робіць надзвычай элегантныя рэчы з дрэва. Прычым з вялікай колькасцю мініяцюрных дэталяў, з ювелірнай дакладнасцю. Майстар карыстаецца лупай і пінцэтам.

— З нашымі ўмельцамі працуюць таленавітыя педагогі Алена Мікуліч і Анатоль Літаеў, — удакладняе Алена Сямёнава. — Алена вельмі добра адчувае, у каго да якой творчасці ляжыць сэрца, Анатоль кіруе мужчынскай камандай, якая займаецца вырабамі з дрэва. У нас тут свае музыканты, спевакі, майстры гутарковага жанру. Тая ж Вера Буйноўская і вершы піша, і байкі расказвае. Ёй 84 гады, а яна яшчэ маладым форы дасць. Яна ж удзельніца ансамбля «Сябрына». У нас там два гарманісты ёсць. Без гэтага ансамбля ніводны канцэрт не абыходзіцца. Да нас у госці таксама прыязджаюць розныя творчыя калектывы. Так што ёсць стымул удасканальвацца.

Асобная гаворка пра спартыўныя дасягненні тутэйшых жыхароў. Спартыўная каманда «Раста» — пастаянная ўдзельніца раённых, абласных і нават міжнародных (такіх як «Залаты леў») спаборніцтваў па інваспорце. За мінулы год заваявалі 34 медалі! Ліліі Курс няма роўных па бочэ, а Алена Някрасава спрытна гуляе ў карнхол. Зараз яна асвойвае новую гульню новус, бо, як яе яшчэ называюць, марскі більярд. Гульню падарылі ў якасці прыза за чарговую перамогу. У камандзе ёсць добрыя гульцы ў шашкі. Той жа Мікалай Шаўцоў ніколі не вяртаецца са спаборніцтваў без медаля. Кіруе камандай па інваспорце і натхняе яе на перамогі псіхолаг Ірына Васіна.

А нядаўна па прапанове кіраўніка гуртка па рабоце з драўнінай Анатоля Літаева ўстанова паспрабавала свае сілы ў новай для сябе дзейнасці — пчалярстве. Пазалетась каля дома-інтэрната быў высаджаны сад надзеі — 100 фруктовых дрэў і 150 пладова-ягадных кустоў. З набыццём саджанцаў дапамаглі прафсаюз работнікаў АПК і фермеры. Ідэя з пчалярствам была дарэчы, бо хацелася, каб сад лепш пладаносіў. Летась прадпрымальнік з Дрыбінскага раёна Міхаіл Грашчанка перадаў расцянскім пчалярам чатыры вуллі з сем'ямі. Пчолкі пастараліся і забяспечылі сваіх гаспадароў першым мядком. Гэта натхніла пачаткоўцаў. Пад кіраўніцтвам Анатоля Літаева тут утварылася лячэбна-працоўная майстэрня «Пчаляр», якая аб'ядноўвае шэсць чалавек. Яны старанна выконваюць свае абавязкі. Нават зараз, калі пчолы спяць, двойчы на тыдзень ходзяць правяраць, ці ўсё добра ў пчаліным царстве.

— Мы збіраемся развіваць гэты кірунак, таму летась напісалі праект і размясцілі яго на сайце аблвыканкама, — расказвае дырэктар установы. — Сэнс у тым, што мы хацелі б павялічыць колькасць вулляў і займацца па-сур'ёзнаму. Камітэт па працы, занятасці і сацыяльным абслугоўванні Магілёўскага аблвыканкама нас падтрымлівае. Ён наогул увесь час з намі на сувязі, заўсёды дапамагае, накіроўвае. Нечакана хутка знайшліся і спонсары. Фінансавую падтрымку нам аказала пасольства ФРГ. Мы купілі яшчэ шэсць вулляў і неабходны інвентар. Плюс абсталяванне для зоны адпачынку. Заадно рыхтуем новыя домікі для нашых пчолак. Каштоўна тое, што нашы жыхары пастаянна чымсьці занятыя і адчуваюць сябе патрэбнымі грамадству, бо ствараюць для іншых настрой і прыгажосць.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Алены СЯМЁНАВАЙ.

ПАЗВАНІЦЕ БАЦЬКАМ!

Самае цяжкае назіраць, як састарэлыя маці, бацька так і не дачакаліся не тое што прыезду — тэлефоннага званка ад сваіх дзяцей. Аб самым прыемным і эмацыянальна цяжкім у рабоце сацыяльнага надомнага памочніка і каардынацыі дапамогі ў аддаленых маланаселеных вёсках інтэрв'ю «Звязды» з прадстаўнікамі сацыяльнай службы Кармянскага раёна Гомельскай вобласці.

Не ў сырніках справа

Галіна Галаўнёва адрасатаў сацыяльнай службы, якім яна аказвае надомную дапамогу, падапечнымі не называе, — толькі «мае бабулечкі, дзядулечкі». Супрацоўнік тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кармянскага раёна ў прафесіі восьмы год. За гэты час дапамагала амаль двум дзясяткам пенсіянераў, жыхарам раённага цэнтра Карма.

— Сёння мая зона адказнасці — дзевяць састарэлых ва ўзросце ад 73 да 85 гадоў, — расказвае Галіна. — Гэта адзінокія пенсіянеры, сямейныя пары. Пражываюць яны як у шматкватэрных дамах, так і ў прыватным сектары.

У кватэры працуе паўтары гадзіны, у прыватным доме — дзве гадзіны 40 хвілін. Змена, кажа, пралятае імгненна.

— Мне падабаецца, што работа мая рэальна патрэбная: бачны яе вынік, табе рады і сапраўды цэняць. Людзі мяне чакаюць, яны так шчыра ўдзячны, што словамі гэта цяжка перадаць, — дзеліцца сацыяльны работнік.

Загадзя, на выхадных, яна складае спіс, каму з падапечных што патрэбна. Каб не марнаваць час, прыязджае на дом да іх з тым, што прасілі: прадукты, лекі, бытавыя тавары. Перасоўваецца Галіна на ўласнай машыне. Гэта яе асабістая ініцыятыва.

— Калі хтосьці з маіх дзядуляў ці бабуль просіць нешта прывезці ці іх адвезці па тэрміновай справе, у тую ж паліклініку, ну як я магу адмовіць? Абавязкова суправаджаю, — дадае суразмоўца.

У дзень наведвае да пяці адрасатаў. У прыватным доме прыносіць дровы, паліць у печы. Калі вада не падведзена — ідзе па яе ў калодзеж. У сезон па асобнай дамоўленасці з цэнтрам тэрытарыяльнага абслугоўвання насельніцтва дапамагае па гаспадарцы ў агародзе, садзе.

Арганізацыя выязных гурткоў па інтарэсах для людзей «залатога» ўзросту.

— Радую сваіх старых дамашняй ежай. Усе вельмі любяць сырнікі, блінчыкі з тварагом, малочны суп з вермішэллю, рэдзенькае бульбяное пюрэ. Аднойчы разгубілася, калі бабуля папрасіла: «Зрабі, калі ласка, драчонікі». Высветлілася, што гэта катлеты з фаршу, бульбы і цыбулі, — і праз такія дэталі імкнецца перадаць цеплыню свайго служэння Галіна.

Сацработнік дзеліцца, што з яе асабістага назірання, дарослыя дзеці, што жывуць далёка ад нядужых бацькоў, клапоцяцца аб іх намнога актыўней, чым тыя, хто жыве побач.

— Калі здараецца, што пажылому чалавеку неабходная шпіталізацыя, тэлефаную дзецям. Адны за сотні кіламетраў адразу зрываюцца, а другія жывуць у суседнім дварэ і не прыйдуць. Гэта самае цяжкае ў маёй рабоце — назіраць, як старыя так і не дачакаліся не тое што візіту — тэлефоннага званка ад сваіх дзяцей, унукаў. Бо якім бы добрым ні быў сацработнік, кожны чакае ўвагі менавіта ад родных.

Асабістая ініцыятыва і лісты да дзяцей

Сёння на ўліку ў Кармянскім тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва амаль 200 адзінокіх пажылых людзей, каля 80 адзінокіх інвалідаў 1-й і 2-й груп. Усяго сацыяльную падтрымку раённай службы атрымлівае больш за дзве тысячы грамадзян розных сацыяльных катэгорый.

— Асноўная задача сацыяльнай службы — дапамагчы максімальна доўга заставацца ў родных мясцінах, дома, мець стасункі з іншымі людзьмі, — падкрэслівае **начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Кармянскага райвыканкама Вольга ЗАХАРЭНКА.**

Формаў работы шмат: паслугі сядзелкі і нянькі, дом сумеснага і часовага пражывання, гасцявая, прыёмная, патранатная сям'я. Кармянскі раён стаў першым у Гомельскай вобласці, дзе існуе такая форма падтрымкі ўразлівых людзей, як кватэра для часовага знаходжання. Актыўна выкарыстоўваецца практыка сацыяльных «мабільных брыгад». Гэта работа на выездзе спецыялістаў усіх чатырох профільных аддзяленняў раённага цэнтра сацабслугоўвання насельніцтва, псіхолага і юрыста. Асаблівая ўвага падчас работы сацыяльных мабільных брыгад — праблемам захавання бяспечных умоў жыцця.

— Пішам лісты дзецям, бо часта здараецца, што дапамогу бацькам яны аказваюць несвоечасова ці не аказваюць увогуле, — са шкадаваннем адзначае начальнік упраўлення. — Мы бяром на сябе ініцыятыву, калі бачым, што трэба адрамантаваць праводку ў доме, пячное абсталяванне. Звязваемся з гаспадаркай у гэтым населеным пункце ці наўпрост просім дапамогі ў спецарганізацыі. Мы ў сваю чаргу аказваем адрасную матэрыяльную дапамогу. Напрыклад, для таго каб нарыхтаваць паліва да ацяпляльнага сезона, самі звязваемся з адпаведнай арганізацыяй і праз адрасную дапамогу выпісваем дровы для пенсіянера.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ПЕРАВАГІ «ЗАЛАТОГА» ЎЗРОСТУ

дапамагаюць адчуць у Кобрынскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання

Гісторыя Таццяны Быцко, кіраўніка клуба самадзейнай творчасці «Сустрэча» пры Кобрынскім ТЦСАН, відаць, у многім тыповая. Усё жыццё была ўзорнай працаўніцай, маці і гаспадыняй дома, а яшчэ актывісткай, у маладыя гады — камсамолкай, спартсменкай. А выйшла на пенсію — неяк усё пайшло-паехала: страты сяброў, знаёмых, праблемы са здароўем... Адным словам, у цэнтр збегла ад дэпрэсіі, якая ледзь не наступала на пяты. І не пашкадавала.

Кіраўнік «Сустрэчы»

Таццяна Васілеўна стала арганізатарам, кіраўніком, ідэйным натхняльнікам клуба мастацкай самадзейнасці «Сустрэча». Раней яна не адно дзесяцігоддзе выкладала ў прафесійна-тэхнічнай установе канкрэтную дысцыпліну, пры гэтым арганізоўвала там мастацкую самадзейнасць. Так што вопыт быў і талент у прыдачу, бо ў яе сям'і ўсе спявалі і спяваюць: раней бацькі, зараз сёстры, пляменніца — оперная спявачка, якая жыве ў сталіцы. Тут жанчына на грамадскіх пачатках узначаліла калектыў аднадумцаў розных узростаў.

— Такога калектыву, які сабраўся ў нас, я раней не сустракала, — гаворыць Таццяна Быцко. — Настолькі мае таварышы адказныя, самаадданыя людзі. У некаторых жа ўзрост вельмі шаноўны, ногі баляць, іншыя праблемы са здароўем, а яны не зважаюць, не прапускаюць ніводнай рэпетыцыі альбо выступлення. Перыядычна мы выязджаем на канцэрты. Выязджаць абавязкова трэба, інакш — творчы застой.

Клуб «Стымул» у паходзе.

У «Сустрэчы» вельмі розны рэпертуар, у ім ёсць і сучасныя, і народныя песні. Расказалі пра адну з «зорак» калектыву — 86-гадовую Марыю Ерамееўну Курыгу. Сваю каронную кампазіцыю «Як служыла я ў пана» яна выконвае ў такім тэмпе, што ніводзін малады, хто браўся, не здолеў паўтарыць. А як яна выступае ў ролі цыганкі з люлькай! Адным словам, яе выхад на сцэну кожны раз сустракаецца публікай з асаблівай цеплынёй.

Як без гэтага жыць?

Ездзіць «Сустрэча» па сёлах, і заўсёды на выступленнях — аншлаг, месца вольнага не знойдзеш. У калектыве зараз займаецца 15 чалавек. Калі Надзея Аляксееўна Саннікава выканала танец пад цыганскую песню, то я адразу спытала, ці займалася яна танцамі раней. «Што вы? — усміхнулася самадзейная артыстка, — я ў мінулым настаўніца». Хто працаваў у прамысловасці, хто — у гандлі, нямала педагогаў, але ўсе знайшлі аднадумцаў, надзейных сяброў у гэтым калектыве, лічаць Марыя Чопка, Галіна Турупчук, Валянціна Шамчук, Таццяна Руцкая.

— Мы ўжо без гэтага жыць не можам, — кажуць жанчыны. — Для нас аўторак, дзень рэпетыцыі, як свята. Усе прыходзяць прыгожа апранутыя, падфарбаваныя, у добрым настроі. Стасункі працягваюцца і па-за цэнтрам. Збіраемся ў некага дома, адзначаем святы, віншуем адно аднаго са святамі. Гэта, адназначна дапамагае жыць.

Стымулы для развіцця

«Сустрэча» — адзін з пяці клубаў па інтарэсах Кобрынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Яшчэ тут функцыянуе шэсць гурткоў для пажылых людзей. **Дырэктар цэнтра Наталля ВОСІПАВА** гаворыць, што кожны год для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў праводзіцца больш за 100 культурна-масавых мерапрыемстваў.

— Апошнім часам работнікі асвоілі такі кірунак, як правядзенне мерапрыемстваў дыстанцыйна, — працягвае Наталля Валянцінаўна. — ТЦСАН супрацоўнічае з раённай ветэранскай арганізацыяй, грамадскімі, рэлігійнымі аб'яднаннямі. Усё робіцца для камфорту, сацыяльнай адаптацыі чалавека, які выходзіць на пенсію, калі гаварыць пра гэты кірунак работы. Выключэнне пажылога чалавека з актыўнай выццядзейнасці, змена характару яго зносін з навакольнымі людзьмі часта становяцца праблемай, здараецца, вострай і хваравітай. Мы нярэдка назіраем, як у нас яна вырашаецца, як людзі ажываюць і расцвітаюць у новай для сябе форме занятасці.

Скажам, клуб «Залаты ўзрост» праводзіць экскурсіі, вечары адпачынку, конкурсы, святы. У клубе «Альтэрнатыва» выяўляюць творчыя здольнасці, праводзяць інтэлектуальныя заняткі. Клуб фізічнай актыўнасці «Стымул» — гэта спартыўныя практыкаванні, навучанне здароваму ладу жыцця пад кіраўніцтвам валанцёра Галіны Пукіты. Паўтара дзясятка членаў клуба займаюцца тры разы на тыдзень у спартыўнай і трэнажорных залах, і вельмі ўдзячныя за такую магчымасць. Галіна Пятроўна сказала, што ім нядаўна купілі гімнастычныя палкі, гантэлі, іншую патрэбную для заняткаў атрыбутыку. Акрамя трэніровак усе яны наведваюць басейн, адным словам, у «Стымуле» займаюцца людзі з адказным стаўленнем да здароўя, як і ў гуртку «Скандынаўская хада».

А вось тэатральны гурток «Забава» сабраў прыхільнікаў тэатральнай творчасці. Рэжысёр па адукацыі Дзмітрый Чаплюн развучвае са сваімі падшэфнымі эцюды, сцэнкі, урыўкі з п'ес, дапамагае асвойваць мастацкае чытанне.

Рэзервы асабістага патэнцыялу

Супрацоўнікі ж у сваю чаргу кажуць, што многаму вучацца ў сталых людзей. **Загадчыца аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту Наталля ЛУКАШУК** расказала, што аддзяленне функцыянуе з 2007 года. Пад установу перададзены двухпавярховы будынак былога ваеннага гарадка.

— За час работы у цэнтры маё жыццё істотна змянілася, — прызнаецца Наталля Лукашук. — Можна сказаць, што я навучылася радавацца кожнаму дню і жыць на пазітыве. У гэтых людзей варта вучыцца мудрасці, цярплівасці. Раней, калі задумвалася аб будучай пенсіі, для мяне яна выглядала незразумелай перспектывай, нават з лёгкім адценнем страху, а цяпер гляджу на гэта з аптымізмам і надзеяй. Бо бачу нашых актыўных, пазітыўных, усебакова развітых пенсіянераў і радуюся. Аказваецца, можна цікава арганізаваць сваё жыццё, шмат чытаць, ажыццявіць тое, што не паспеў у маладосці з-за працы і сямейных клопатаў. Аднойчы ў нашых сценах я пачула: «Тое, што чалавек мае ў сабе самім, яму ніколі так не спатрэбіцца, як у старасці. Варта ўсяляк развіваць і заахвочваць свой асабісты патэнцыял». Думаю, у гэтым хаваецца сапраўдная мудрасць жыцця.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Зварот у рэдакцыю

СПРАВА БЫЛА ЗУСІМ НЕ Ў ТРУБЕ?

Мы з мамай (ёй за 80) жывём у двухпавярховым, двухпад'ездным доме на першым паверсе, — піша (ліст друкуецца са скарачэннямі і ў пераказе. — **Рэд.**) **Людміла БЫКАВА з аграгарадка Негарэлае, што на Дзяржыншчыне.** *— Апошнім часам наша кватэра перыядычна затапляецца змесцівам каналізацыі... Паток яго можна спыніць, толькі перакрыўшы кран у падвале. У мамы — калі я на рабоце — на гэта не хапае сіл (ёй даводзіцца прасіць дапамогі ў суседзяў)... Да таго ж, людзі, якія жывуць над намі, на другім паверсе, вельмі абураюцца, бо да іх тады не паступае вада...*

Такая ж праблема і ў жыхароў суседняга пад'езда.

Мінулым летам мы самі памянялі каналізацыйныя трубы, унітаз, і ўсё роўна рэгулярна выклікаем сантэхніка. Ён казаў, што, калі б своечасова адпампоўвалі каналізацыю, мы ў яго паслугах не мелі б патрэбы, але пакуль, як я зразумела, на нашым доме паставілі крыж. Адпампоўку робяць толькі пасля штодзённых званкоў, разы тры на месяц... А чаму жыхары павінны «абрываць» тэлефоны і прасіць, каб да іх прыехалі не пасля, а ***да таго,*** *як пачнуцца, мякка кажучы, непрыемнасці? Чаму б не распрацаваць графік правядзення работ?*

На гэтыя пытанні рэдакцыя «Звязды» папрасіла адказаць кіраўніцтва **КУП «Водаканал Дзяржынскага раёна».**

Як паведамляецца ў афіцыйным адказе за подпісам **дырэктара Аляксандра Жыгаліна,** спецыялісты прадпрыемства з выездам на месца абследавалі сістэму водаадвядзення ад дома № 139 па вуліцы Ленінскай. Яна ў спраўным стане. Калодзежы вулічнай сістэмы, якія служаць для прыёму каналізацыйных сцёкаў, знаходзяцца ніжэй за ўзровень кватэр, размешчаных на першым паверсе будынка. Такім чынам, падтапленне кватэры заяўніцы сцёкамі ніякім чынам не звязана з перапаўненнем калодзежаў.

Праблема выцякання сцёкавых вод з каналізацыйных калодзежаў у зімні перыяд 2022-2023 звязаная з умовамі надвор'я (дождж, адліга). Ліўневыя воды сталі часткова трапляць у калодзежы, а паколькі каналізацыйная сістэма дома № 139 замкнутага тыпу (не звязаная з цэнтралізаванымі сеткамі водазабеспячэння), адбылося перапаўненне. Прадпрыемства распрацавала і зацвердзіла графік вывазу сцёкавых вод з калодзежа ад дома № 139, ён будзе ажыццяўляцца кожны тыдзень — у аўторак і пятніцу.

...Каб упэўніцца ў тым, што ўсё гэта адпавядае сапраўднасці, мы патэлефанавалі **майстру КУП «Водаканал Дзяржынскага раёна»: Алеся Кульбіцкая** патлумачыла, што ёй гэты ўчастак перадалі зусім нядаўна. «Па аўторках і пятніцах пасля адпампоўвання каналізацыі я асабіста, — паабяцала майстар, — буду глядзець што там і як. Калі калодзежы ўсё роўна будуць перапаўняцца, мы адправім тэхніку дадаткова... Гэтае пытанне трэба трымаць на кантролі, высвятляць прычыну... Часта бывае, што ў дрэннай рабоце каналізацыі жыхары вінаваты самі, бо выкідваюць ва ўнітазы ўсё, што трапіць пад руку — ад напаўняльнікаў для каціных латкоў да вільготных сурвэтак і анч... Мы адпампуем септык і праверым, ці сыходзіць з дома вада, калі не, значыць будзем падключаць спецыялістаў, каб прабіць унутрыдамавую каналізацыю. А пакуль — прапанавала майстар — можаце перадаць заяўніцы мой службовы нумар тэлефона. Калі з'явяцца нейкія праблемы, яна зможа тут жа паведаміць мне ці напісаць на Viber... Мы стараемся не пакідаць людзей у бядзе».

...Шчыра кажучы, на гэты раз рэдакцыю парадавала і аператыўнасць, і грунтоўнасць, з якой работнікі раённага водаканала падышлі да вырашэння праблемы.

Хочацца верыць, што пасля звароту ў газету парадуюцца і жыхары названага дома: то-бок праблем з каналізацыяй у іх болей не будзе.

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Чалавек — чалавеку

«МУСІЦЬ, НЕШТА ЎПУСКАЕМ МЫ Ў ВЫХАВАННІ ДЗЯЦЕЙ?»

Праўду кажуць: у каго няўдача, той і плача ды піша ў газету «Звязда».
Я тут не выключэнне, хоць непрыемнасці на гэты раз не столькі ў мяне: Рая, прыяцелька мая, каторую ноч не спіць. На дачку пакрыўдзілася, на сваіх любімых унучак. Як на нейчы погляд — дык, можа, і дарэмна (падумаеш...), як на яе і на мой...

Калі па парадку, дык Рая жыве ў цэнтры раёне цэлага райцэнтра. А дачка яе — у Мінску. Там у яе добрая кватэра, муж, двое дзяцей і нават дзве жывёліны: сабачка (важыць, казала, кілаграма паўтара) і кацяра (той на ўсе пяць зацягне).

З-за іх, уласна, усё і пачалося, бо сям'я дачкі надумала ў адпачынак махнуць — да чорта на рогі. Гадаванцаў туды не пацягнеш. Можна было на ператрымку здаць... Але ж палічылі, што гэта дарагавата, ды і навошта грошы выкідваць, калі мама ёсць, калі яна ўжо на пенсіі, а значыць, час мае — даглядзіць.

Раі гэта ідэя зусім не спадабалася, але ж якая маці ды бабуля не хоча, каб радні найлепей было?! Згадзілася.

У прызначаны дзень гадаванцаў да яе зяць з дачкою прывезлі, акруціліся ды паехалі чамаданы складаць. Рая засталася з «пастаяльцамі».

Тыя, казала, у дарозе, відаць, стаміліся, бо адразу ж паснулі і захраплі. (Гаспадыня б не супраць, каб вось так — усе дзесяць дзён.) Але ж госці прачнуліся, абнюхалі тэрыторыю (добра, што не памецілі), пад'елі і на «радасць» новай глядачцы захацелі падурэць. Кот, каравцей, пагнаўся за сабачкам і ледзь не прыдушыў (разнімаць прыйшлося), потым сабачка пабег за катом. Той, цялепень, як ні дзіўна, змог разагнацца і нават сігануць на штору.

Сагнаць яго Рая не паспела: ён сам упаў — разам з... карнізам, які «па дарозе» ўніз «знёс» з падаконніка пяць вазонаў і са стала — дарагую вазу (падарунак нябожчыка мужа).

Перапала, відаць, і кату з сабакам. Прычым малы з-пад тканін яшчэ неяк выбраўся, а вось вялікі...

З перапуду ці што — кот усімі кіпцюрамі, мёртвай хваткай, учапіўся ў штору і так нема роў, што ў кватэру сталі грукаць суседзі (думалі, што некага душаць).

Гэта быў дзень першы. Не абышлося без прыгод і ў ноч (як першую, так і ў дзевяць наступных), бо «кватаранты», абодва, хацелі спаць толькі на ложку. «А веніка вы не хацелі?» — папыталася ў іх Раіса і сапраўды стала спаць з венікам.

Роспытаў, непрыемнасцяў нацярпелася яна і ў час прагулак, бо і ў сваім двары, і ў суседніх яе ды нябожчыка мужа ўсе ведалі як сур'ёзных, прыстойных людзей, а тут раптам (ці не здзяцінела баба?) — ходзіць з катом на спецыяльнай шворачцы, з сабачкам на павадку (той у куртачцы, у тапачках).

...Вось гэтак прыкладна ўсе дзесяць дзён жанчына і пражыла: дачакацца не магла, пакуль дачка з сям'ёю прыедзе!

А прычакала (нарэшце, у поўным складзе!) і вачам не паверыла. Усе, унучкі (гэта няхай сабе), але ж і дачка з зяцем адразу кінуліся да ката, да сабакі: на рукі абодвух — ціскаюць, гладзяць, цалуюць. Маці ў куце стаіць — нікому не цікавая... Нават дачцэ, якой слугавала ўсё жыццё, якой і адукацыю, і вяселле, і грошай — на кватэру, на мэблю, машыну...

Першым, як ні дзіўна, схамянуўся зяць: падышоў, павітаўся. Потым заўважылі бабулю і ўнучкі: сталі распытваць, ці спадабалася ёй трымаць жывёлак, ці весела было? «Яшчэ і як!» — сказала Раіса.

У падрабязнасці яна не ўдавалася. Шторы — яшчэ да прыезду дачкі — перамыла, павесіла на месца (карніз сусед прымацаваў), вазоны перасадзіла... Усё, як быццам, утрэслася. Асадак застаўся ды такі...

Мусіць, і праўда ўпускаем мы нешта ў выхаванні дзяцей, калі каты з сабачкамі ім даражэйшыя? Калі многім не патрэбныя дзеці. І не вельмі цікавыя родныя бацькі.

Соф'я Кусянкова,
Рагачоўскі раён.

Вестки з месцаў

НЕ ХЛЕБАМ АДЗІНЫМ...

Аматарскі тэатр «СМОЛТ» пры нашым раённым Цэнтры культуры парадаваў гледачоў чарговай прэм'ерай. Спектакль-казку «Снежная каралева праз шмат гадоў» паводле вядомага твора Ганса Хрысціяна Андэрсэна паказалі тры разы, і кожны раз глядзельная зала была запоўнена. Гэта — згадзіцеся — пераканаўчы поспех, а тым больш — для маладога і самадзейнага калектыву.

Алена Чурылава (па асноўнай прафесіі — медыцынскі работнік).

Мастацкі кіраўнік тэатра Лёля Сямёнава расказала, што ўдзельнікі самі ствараюць і музычнае афармленне, і сцэнічныя строі, што на гэты конт багатая фантазія ў выхавацелькі дзіцячага садка (а па сумяшчальніцтве памочніка рэжысёра Анастасіі Гадалавай), што ў многім ім, пачаткоўцам, дапамагаюць культработнікі-прафесіяналы.

Дарэчы, сумесна з імі артысты-аматары зладзілі для сваіх старэйшых гледачоў своеасаблівы экскурс у іх мінулае. На працягу амаль дзвюх гадзін публіка з задавальненнем слухала песні ў выкананні Тамары Валчанковай, Ігара Кавальскага, Максіма Пашука, Дар'і Кавалёвай, Святланы Змітровіч, Вікторыі Гневышавай, Яўгеніі Ломаць і іншых. Дарэчы, Жэня, кіраўнік народнага ансамбля «Хутарок», даўно ў складзе аматарскага тэатра, яна там, можна сказаць, прымадонна! Як і яшчэ адна ўдзельніца «Хутарка» Алена Чурылава (па асноўнай прафесіі — медыцынскі работнік).

Атмасферу далёкіх 70-х, 80-х, 90-х і так званых нулявых гадоў выдатна аднавілі відэазастаўкі, саўндтрэкі, якія стварыў Сяргей Шухно. Выступленні спевакоў упрыгожылі інсцэніроўкі і падтанцоўкі ў выкананні самадзейных артыстаў, за што асобная падзяка мастацкаму кіраўніку «СМОЛТа» Лёлі Сямёнавай.

Сярод шматлікіх песенных рэмейкаў, што прагучалі падчас канцэрта, нават самага патрабавальнага гледача не мог не ўразіць рэмікс на «Сівую ноч» ад народнага ансамбля «Хутарок», а бяспрэчным адкрыццём стаў юны ўдзельнік Паша Петуноў з песняй «Снегіры».

Вопыт прафесіяналаў і энтузіязм аматараў далі цудоўны вынік: шчырыя апладысменты гледачоў, якія з нецярпеннем будуць чакаць новых пастановак і канцэртаў.

Ала Страшынская,
г. Смаргонь.

Дзейныя асобы

ЁН НАРАДЗІЎСЯ ТУТ

85-годдзе Мінскай вобласці — добрая нагода, каб успомніць землякоў, чые імёны вядомыя далёка за межамі Міншчыны.

Вучні нашай школы № 2 падрыхтавалі, напрыклад, бенефіс у гонар доктара гістарычных навук Эмануіла Рыгоравіча Іофе, які скончыў гэтую навучальную ўстанову ў 1956 годзе, а потым...

Дыяпазон навуковых інтарэсаў выпускніка — гісторыя (у тым ліку ваенная), сацыялогія, паліталогія. Эмануіл Рыгоравіч — аўтар звыш дзвюх тысяч навуковых работ, 48 кніг (у тым ліку пра Беразіно), навуковы кансультант 50 радыё- і тэлеперадач, 18-га тома БСЭ і 8-га тома Энцыклапедыі гісторыі Беларусі...

Унікальныя фатаграфіі з сямейнага архіва дапамаглі зацікаўленым бярэзінскім школьнікам уявіць карціну нялёгкага ваеннага побыту сям'і Іофе ў Казахстане ў гады эвакуацыі, пасляваеннага дзяцінства ў бацькоўскай хаце на вуліцы Камсамольскай, прафесарскія будні акадэміка ў БДПУ імя М. Танка, дзе Эмануіл Рыгоравіч 44 гады працаваў выкладчыкам, шчасце бацькі дзвюх дарослых дачок і дзядулі пяці ўнукаў.

Вечары-прысвячэнні іншым землякам пройдуць у шасці аграгарадках раёна.

Тамара Круталевіч,
г. Беразіно.

Усмешачку!

ЧАКАНЫЯ СЛОВЫ

Напэўна, кожны — і той, хто мае дома катоў, сабак, папугаяў, і той, хто не мае — можа расказаць пра іх нешта пацешнае.

У майго дзядзькі некалі быў сабака. Гаспадар, нягледзячы на хворыя ногі, сам выводзіў яго на вуліцу, прычым — у любое надвор'е.

У той раз вельмі ветрана было, так што гулялі яны зусім нядоўга. «Холадна табе? Прамёрз? — папытаўся дзядзька ў сабакі. І тут жа суцешыў: — Нічога не зробіш — зіма... Але ж яна хутка скончыцца, а пацяплее — мы з табой паедзем на дачу».

За размовамі і з гэтай думкай дзядзька дайшоў да свайго пад'езда, азірнуўся — сабакі няма. Стаў клікаць — дарэмна. З надзеяй, што сябра нейкім чынам абагнаў і суседзі завялі яго дадому, дзядзька зайшоў у кватэру, але і там сабакі не было.

Гаспадар шукаў яго досыць доўга, а вось знайшоў зусім выпадкова: сабака сядзеў на прыпынку, з якога яны... ад'язджалі на дачу. Трэба разумець, засумаваў?

А дзядзька з тога часу стаў думаць, што казаць пры сабаку, што не.

Таццяна Савельева,
г. Мінск.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
1 лютага 2023 г. № 4 (690)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

АЗДАРАВІЦЦА ДУХОЎНА

Як турыстычны патэнцыял выкарыстаць у патрыятычным выхаванні і абуджэнні стваральнай грамадзянскай пазіцыі? Вопыт Гомельскага раёна вывучалі дэпутаты рэгіёна

УМАЦАВАННЕ ў грамадстве ідэй міру і стваральнай працы праз развіццё турыстычнай сферы. Менавіта такую тэму для пераймання вопыту абраў Гомельскі раён для правядзення першага ў гэтым годзе традыцыйнага навучальнага семінара для старшынь Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню. Гомельскі абласны Савет дэпутатаў актыўна працягвае практыку падобных сустрэч, важнасць якіх цяжка пераацаніць. Вядома, што ў кожным раёне вобласці свой асаблівы стыль работы, свая сістэма ўзаемадзеяння паміж органамі ўлады і мясцовымі жыхарамі. Таму выязныя сустрэчы дэпутатаў дапамагаюць дзяліцца вопытам работы на месцах, пераймаць новы досвед. Кіраўнікі раённых Саветаў дэпутатаў выступаюць з ініцыятывай, якое сацыяльна значнае пытанне разгледзець на прыкладзе іх раёна.

Гомельскі раён мае багаты турыстычны патэнцыял. Яго эфектыўнае выкарыстанне – важны кірунак дзейнасці ў Год міру і стварэння. Гэта і ўдасканаленне ваенна-патрыятычнага выхавання, садзейнічанне міжканфесійнаму дыялогу, падтрымка мірных ініцыятыў грамадзян. На арыенціры ў гэтай дзейнасці на пачатку выязнога семінара звярнула ўвагу **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ.**

З перспектывамі развіцця рознанакіраванай турыстычнай сферы дэпутаты азнаёміліся на прыкладзе Чонкаўскага сельсавета. Размешчаны тут ваенна-гістарычны комплекс «Партызанская крынічка» абуджае цікавасць да вывучэння гісторыі партызанскай барацьбы з фашысцкімі акупантамі. Зямлянкі гэтага музея пад адкрытым небам узнаўляліся па дзённіках легендарнага партызанскага камандзіра Емяльяна Барыкіна і дапамагаюць адчуць атмасферу партызанскага побыту.

Дэпутаты Гомельшчыны на гэтым знакавым для рэгіёна месцы памяці далучыліся да цырымоніі прыняцця ў атрад «Юных міратворцаў» школьнікаў Галавінскай сярэдняй школы. Вучні яе вядуць актыўную валанцёрскую дзейнасць, бяруць удзел ва ўсіх патрыятычных акцыях Беларускага фонду міру. Як адзначыла **старшыня раённай арганізацыі Беларускага фонду міру Ірына ТРАЦЦЯК,** Галавінская сярэдняя школа стала першай у Гомельскім раёне ўстановай адукацыі, дзе працуе атрад юных міратворцаў.

З духоўным выхаваннем дзяцей і моладзі праз вывучэнне праваслаўных традыцый удзельнікі семінара азнаёміліся на прыкладзе работы нядзельных школ пры храме Ціхвінскай іконы Божай Маці ў Чонках.

– Тут дзейнічаюць школы для розных узроставых груп. Дзецям у даступнай форме расказваюць аб маральных каштоўнасцях хрысціянства. З малодшымі праводзяць гульні, а са старэйшымі рыхтуюць невялікія тэатральныя пастаноўкі. Вынікам такой работы стаў вялікі калядны канцэрт, – расказаў **настаяцель храма, іерэй Віталь ПАРТЫЙ.**

Заняткі ў дзіцячай нядзельнай школе праводзяць вернікі, якія скончылі біблейска-багаслоўскія курсы Гомельскай епархіі. Дэпутатам аб занятках у храме распавялі самі выхаванцы. Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Зенкевіч уручыла дзецям салодкія падарункі.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

«Мы маем справу з прынцыпам народаўладдзя»

У панядзелак у Савеце Рэспублікі прайшло пасяджэнне дзясятай сесіі сёмага склікання, падчас якога сенатары адобрылі законапраекты, якія рэгулююць грамадска-палітычны лад у краіне. Адзін з іх – **«Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў».** Гістарычнай падзеяй стала адабрэнне законапраекта «Аб Усебеларускім народным сходзе». «Мы можам канстатаваць, што ўсе разам з гэтай задачай справіліся. Калі я гавару «ўсе разам», то маю на ўвазе не толькі парламентарыяў, але і ўсіх грамадзян нашай краіны», – адзначыў **Сяргей Сівец, старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.** Ён падкрэсліў, што законапраект аб УНС актыўна разглядаўся, выносіўся на грамадскае абмеркаванне, дапрацоўваўся з улікам унесеных прапаноў. «Гэта якраз сведчанне таго, што мы маем справу з прамой дэмакратыяй, прамым волевыяўленнем народа, прынцыпам народаўладдзя. Мяркую, аўтарам гэтага законапраекта выступае ўсё беларускае грамадства, усе беларускія грамадзяне», – сказаў сенатар.

Праект Закона **«Аб Усебеларускім народным сходзе»** накіраваны на рэалізацыю рашэння рэспубліканскага рэферэндуму ад 27 лютага 2022 года, якім прыняты змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Законапраектам вызначаюцца кампетэнцыя, парадак фарміравання і дзейнасці Усебеларускага народнага сходу.

Сенатары на пасяджэнні дзясятай сесіі адобрылі законапраект – **«Аб асновах грамадзянскай супольнасці».** Праектам закона ўстанаўліваюцца прававыя і арганізацыйныя асновы ўзаемадзеяння дзяржавы і грамадзянскай супольнасці для павышэння ўзроўню грамадзянскай адказнасці, прававой культуры, уключэння насельніцтва ў вырашэнне значных грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных пытанняў, фарміравання навыкаў па ажыццяўленні канструктыўнай сацыяльна-палітычнай дзейнасці, накіраванай на абарону і рэалізацыю нацыянальных інтарэсаў. Пад грамадзянскай супольнасцю прапануецца разумець грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Беларусі, выказваюць сваю пазіцыю праз удзел у грамадскіх адносінах і інстытутах, не забароненых заканадаўствам.

Таксама падчас пасяджэння дзясятай сесіі Савета Рэспублікі сенатарамі былі разгледжаны дакументы, якія рэгулююць міжнароднае супрацоўніцтва ў розных сферах. У прыватнасці, сенатары адобрылі законапраект «Аб ратыфікацыі Чацвёртага пратакола аб унясенні змяненняў у Статут Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы ад 7 кастрычніка 2002 года». Ратыфікацыя пратакола адпавядае нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь і адпавядае абавязацельствам у рамках АДКБ. Гэтыя дапаўненні накіраваны на ўдасканаленне прававой асновы АДКБ і павышэнне эфектыўнасці дзейнасці гэтай арганізацыі.

Сенатары адобрылі законапраект «Аб прыпыненні дзеяння Пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Рэспублікі Польшча аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі». Быў адобраны законапраект «Аб спыненні дзеяння Пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Французскай Рэспублікі аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, адукацыі, навукі і тэхнікі, сродкаў масавай інфармацыі». У мэтах развіцця двухбаковых адносін Беларусі і Таджыкістана адобраны законапраект «Аб ратыфікацыі Пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Рэспублікі Таджыкістан аб сістэме садзейнічання ўзаемнаму гандлю».

Валерыя СЦЯЦКО.

ПЛЯЦОЎКА

АБ'ЯДНАЦЬ І ПАДТРЫМАЦЬ ІНІЦЫЯТЫВЫ

У «Дэпутацкім клубе» сенатары і дэпутаты расказалі аб праектах, да якіх можа далучыцца кожны

«Дэпутацкі клуб», прысвечаны аб'яўленаму Прэзідэнтам Беларусі Году міру і стварэння, прайшоў у агенцтве «Мінск-Навіны». Для ўдзелу ў дыскусіі былі запрошаны старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ, старшыня РГА «Белая Русь», член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Алег РАМАНАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Аксана ГАЙДУК, дэпутат Мінгарсавета, рэктар Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў Наталля КАРЧЭЎСКАЯ, дэпутат Мінгарсавета, галоўны ўрач 21-й цэнтральнай раённай паліклінікі Заводскага раёна сталіцы Наталля МЫСЛІЎЧЫК, а таксама маладыя актывісты БРСМ, «Белай Русі», Мінгарсавета. Мадэратарам сустрэчы выступіў старшыня праўлення Беларускага саюза журналістаў Андрэй КРЫВАШЭЕЎ.

Фота «Мінск-Навасці».

— Ужо па першых публічных выступленнях кіраўніка дзяржавы зразумела, якая тэматыка будзе ляжаць у аснове ключавых акцый і форумаў, прывязаных да Года міру і стварэння. Гэта і ваенна-патрыятычнае, і духоўна-маральнае выхаванне. Гэта захаванне сямейных традыцый моцнай беларускай сям'і. Гэта эканоміка, а таксама сацыяльная абарона, — адзначыў Андрэй Крывашэеў.

Ён выказаў меркаванне, што паўдзельнічаць у мерапрыемствах Года міру і стварэння можна на любым узроўні — свайго пад'езда, двара, мікрараёна, горада і краіны ў цэлым.

Алег Раманаў адзначыў, што важным вымярэннем Года міру і стварэння з'яўляецца забеспячэнне грамадзянскай згоды. І ў гэтым аспекце па-ранейшаму актуальнай застаецца тэма асветы. А таксама інфармацыйная работа, у прыватнасці, з новымі медыя. Гэта «Тэлеграм», «Інстаграм», дзе рэгулярна фарміруецца вялікая плынь інфармацыі, якая ўплывае на свядомасць людзей, і тут неабходна ствараць свой кантэнт — прывабны, цікавы, нясумны, каб быць значным суб'ектам інфармацыйнай палітыкі.

— Грамадства з'яўляецца моцным, калі яно згуртаванае ўстойлівымі сувязямі ўзаемадапамогі, падтрымкі, удзелу, салідарнасці. А яны ўсталёўваюцца падчас сумеснай дзейнасці — у працы, праектах, акцыях, у тым ліку палітычных, дзе людзі адчуваюць плячо адзін аднаго. І мы мусім такім чынам яднаць грамадства, — дадаў Алег Раманаў.

Як бачаць рэалізацыю Года міру і стварэння у рэгіёнах, расказаў Віктар Лісковіч.

— Найперш, гэта праект «Цягнік памяці — 2023», які працягне традыцыю 2022 года і пройдзе пад патранажам Саюзнай дзяржавы. Стартуе акцыя 22 чэрвеня, і адзін з прыпыначных пунктаў — горад Уфа, дзе пройдзе юбілейны X Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, — расказаў сенатар.

Цікавы праект плануецца летам і ў Свіслацкім раёне пад назвай «Бацькава булка». Ён будзе праходзіць другі раз.

— Нарадзіўся праект пасля наведвання хлебазавода кіраўніком нашай дзяржавы. Яму спадабаўся адзін з рэцэптаў, і гэтаму вырабу далі назву «Бацькава булка», а потым нарадзіўся і фестываль, — расказаў Віктар Лісковіч. — Мерапрыемства будзе арганізавана не толькі для работнікаў сельскай гаспадаркі, але і гандлю, вытворцаў хлебабулачных вырабаў.

А пачаўся Год міру і стварэння ў Баранавічах выдатным фестывалем «Берасцейскія сані», які таксама прайшоў другі раз пад патранатам губернатара Брэсцкай вобласці. Мерапрыемства сабрала ўвесь рэгіён і прадэманстравала ўсё тое пазітыўнае, чым сёння ганарыцца Брэстчына.

У сталіцы ў Год міру і стварэння гатовы аб'яднаць і падтрымаць любыя ініцыятывы.

— Сёння многія гатовы працаваць валанцёрамі, браць актыўны ўдзел у развіцці сваіх суполак, мясцовага самакіравання, працаваць у тэрытарыяльных органах грамадскага самакіравання, не атрымліваючы пры гэтым ніякай асабістай выгады, — звярнуў увагу Андрэй Бугроў. — Гэта накіравана на развіццё сваіх тэрыторый, свайго горада. Таксама мы будзем падтрымліваць сацыяльныя праекты, праводзіць рэканструкцыю, рамонты сацыяльных аб'ектаў, у бюджэце прадугледжаны адпаведныя затраты. Я ўпэўнены, што сталіца пакажа прыклад удзелу ў стваральнай працы. Мы хочам развівацца і жыць у сваёй краіне — мірнай, бяспечнай, прыгожай, дагледжанай.

Пра прыклады маладзёжных ініцыятыў расказала Наталля Карчэўская.

— Цікавая ідэя ўзнікла падчас дыялогавай пляцоўкі. Адзін са студэнтаў спытаў, ці было б падтрымана стварэнне клуба рэканструкцыі. Пасля ён асабіста падышоў да мяне, і цяпер яны самастойна гэтым займаюцца: падрыхтавалі палажэнне, распрацавалі лагатып, прыдумалі назву. Лічу, што важна даваць маладым такую магчымасць — займацца тым, што цікава ім самім, а не прапанавана дарослымі.

Гэта меркаванне падтрымаў і сакратар камітэта БРСМ Белдзяржуніверсітэта, выкладчык філалагічнага факультэта Міхаіл Дзегцярэнка. Адна з такіх маладзёжных ініцыятыў — Беларускі студэнцкі патрыятычны форум, прымеркаваны да Дня народнага адзінства, які прайшоў летась.

— Гэта студэнцкая ініцыятыва, якая нікім не была прадыктаваная. І мы прыцягнулі ўвагу да міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва не проста на ўзроўні адукацыйных праграм, а на ўзроўні ўзаемадзеяння студэнцкіх саветаў. Пасля гэтага форуму аб'ездзілі ўсю Беларусь. Нас запрашаюць на свае мерапрыемствы розныя навучальныя ўстановы, і мы рыхтуем глебу для далейшай змены кадраў і выхавання новых маладзёжных лідараў.

Алена КРАВЕЦ.

АЗДАРАВІЦЦА ДУХОЎНА

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Чарговым аб'ектам у праграме семінара для старшынь райсаветаў дэпутатаў стаў санаторый «Чонкі». Гісторыя вядомай гомельскай здраўніцы — больш чым векавы вопыт аздараўлення і лячэння. Дэпутаты падзяліліся меркаваннем, што ўключэнне ў турыстычныя маршруты санаторна-курортных арганізацый — перспектыўны кірунак.

— Чонкаўскі сельсавет для многіх павінен стаць прыкладам. Ён дынамічна развіваецца і пры гэтым захоўвае найлепшыя традыцыі. Наведаўшы Чонкі, можна не толькі добра адпачыць, але і аздаравіцца духоўна, — адзначыла ўдзельнік семінара, **старшыня Светлагорскага раённага Савета дэпутатаў Людміла ВЯЛІЧКА.**

Госці Гомельскага раёна таксама пазнаёміліся з работай аграсядзібы «Белая дача», адметнасць якой — стравы беларускай кухні.

— Калі ў 2021 годзе ў раёне адпачылі звыш 16 тысяч чалавек, то ў 2022-м — ужо больш за 19 тысяч. Попыт на паслугі ўнутранага турызму расце з кожным годам, — падкрэсліў **намеснік старшыні Гомельскага райвыканкама Дзяніс ДАВЫДАЎ.**

Развіццё турызму мае не толькі важны эканамічны аспект, але і дапамагае фарміраваць станоўчы імідж раёна, захоўваць традыцыйныя рамёствы, адраджаць малыя населеныя пункты. На гэтыя рэзервы турыстычнай сферы раёна звярнула ўвагу **старшыня Гомельскага раённага Савета дэпутатаў Вікторыя ЛАДУЦЬКА.**

Выязны семінар для старшынь Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню завяршыўся сходам прадстаўнікоў Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.

— У Год міру і стварэння асабліва важна падтрымаць карысныя, патрыятычныя грамадзянскія пачынанні, — звярнулася да прадстаўнікоў органаў мясцовага самакіравання, дзякуючы якім рэалізуюцца ініцыятывы, Вікторыя Ладуцька, якая таксама з'яўляецца старшынёй Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. — Развіццё мясцовых ініцыятыў патрабуе ўдасканалення, і галоўны кірунак — гэта навучанне людзей распрацоўцы праектаў.

Так, Гомельскай абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў летась быў арганізаваны маштабны адукацыйны курс па праектным менеджменце.

І такая практыка на Гомельшчыне працягнецца.

— У трэнінгах бралі ўдзел 44 прадстаўнікі раёнаў, у тым ліку сем кіраўнікоў ініцыятыўных груп. У рамках навучальных семінараў-трэнінгаў у інтэрактыўнай форме ўдзельнікі азнаёміліся з паняццем праекта, асновамі яго напісання і рэалізацыі, творча папрацавалі ў групах, прэзентавалі эскізы праектаў — ініцыятыў развіцця сельскіх тэрыторый, — падкрэсліла Вікторыя Ладуцька.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота газеты «Маяк».

НА ПРЫЁМЕ Ў СЕНАТАРА

Сёння — зварот, заўтра — удасканаленне заканадаўства

СТАРШЫНЯ Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ правёў асабісты прыём грамадзян.

Людзей цікавалі пытанні кааператыўнага будаўніцтва, карыстання зямлёй, а таксама рэабілітацыі пасля перанесеных траўмаў.

З ініцыятывай у правядзенні патрыятычнага праекта выступіў мінчанін Сяргей Васілевіч: ён звярнуўся з просьбай дапамагчы ў рэалізацыі выстаўкі да 80-годдзя вызвалення Смаленскай вобласці ад фашыстаў. «Я ўваходжу ў склад аргкамітэта мерапрыемства, і ў ініцыятыўным парадку мы ўзялі на сябе місію, якая заключаецца ў наступным: распавесці аб баявым шляху вайсковых аб'яднанняў, якія вызвалялі Смаленшчыну, а ў рамках аперацыі «Багратыён» прайшлі праз Беларусь, — распавёў Сяргей Васілевіч. — У нашым архіве захоўваецца каля тысячы негатываў — сведчанні падзей тых часоў. Гэта вельмі важныя дакументы не толькі для нашай краіны, але і для Расійскай Федэрацыі». Галоўная праблема заключаецца ў тым, што мерапрыемства павінна адбыцца ўжо ў сакавіку. Сяргей Рачкоў адзначыў, што ініцыятыва сапраўды важная і патрабуе падтрымкі:

— Па-першае, неабходна, каб у вас з'явіліся партнёры з дзяржаўных структур, якія разам з вамі пачалі б развіваць праект. Але, выходзячы з апісанай сітуацыі, часу да правядзення мерапрыемства засталося не так шмат: мы абавязкова возьмем вашу просьбу на кантроль, я абмяркую гэтае пытанне з кіраўніцтвам грамадскага аб'яднання «Белая Русь», а таксама са старэйшынай Барысам Васілевічам Батурам, які ўзначальвае напрамак гарадоў-набрацімаў. Мяркую, для такой высакароднай місіі атрымаецца знайсці магчымасці, — запэўніў парламентарый.

Сяргей Мікалаевіч з Мінскага раёна звярнуўся да сенатара з праблемай будаўніцтва дома: жыхары раз на месяц уносяць грошы, але ўзвядзенне аб'екта адкладваецца, інфармацыю грамадзяне атрымаць не могуць.

— Мы будзем трымаць сітуацыю на кантролі, зададзім адпаведныя пытанні забудоўшчыку, а таксама звернемся да Мінскага райвыканкама, — адзначыў Сяргей Рачкоў.

Падсумоўваючы вынікі асабістага прыёму грамадзян, парламентарый падкрэсліў, што галоўнае — увага да наведвальнікаў і ўменне выслухаць іх праблемы:

— Ёсць шэраг грамадзян, якія звяртаюцца да нас неаднаразова. Па іх пытаннях ужо былі праведзены сур'ёзныя разборы, але людзі стаяць на сваім. Усе рашэнні, крокі і дзеянні прымаюцца выключна ў рамках закона. Сёння быў цікавы зварот, звязаны з аказаннем садзейнічання ў рэалізацыі ваенна-патрыятычнага праекта паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй: знакавая падзея, звязаная з 80-годдзем вызвалення Смаленска і арганізацыяй фотавыставы айчыннага фотакарэспандэнта. Такія звароты бываюць рэдка. Часцей людзі звяртаюцца з пытаннямі ЖГК, будаўніцтва жылля, працаўладкавання і дзейнасцю праваахоўных органаў.

Сяргей Рачкоў адзначыў, што з адны з самых частых — пытанні дзейнасці садоўніцкіх таварыстваў і землеўпарадкавання.

— Практычна з прыёму ў прыём ёсць адзін-два звароты па гэтай тэме. Людзям складана без дапамогі мясцовых органаў улады разабрацца ў сітуацыі. Як правіла, гэта звязана з выбранем кіраўніка, фінансава-гаспадарчай дзейнасцю праўлення. У гэтых выпадках часцей за ўсё бывае вельмі складаная, заблытаная сітуацыя, нават рашэнні суда не заўсёды выконваюцца. Таму пры актуалізацыі заканадаўства мы ўлічваем пытанне па гэтай тэме. Савет Рэспублікі не застаецца ў баку ад праблем, з якімі звяртаюцца грамадзяне, заўсёды спрабуем знайсці шляхі вырашэння, — рэзюмаваў Сяргей Рачкоў.

Ірына АЛЯКСЕЕВА.

ПЕРАЕМНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ

ЦІКАВЫ ВОПЫТ І ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ

Пра клопаты Маладзёжнага савета расказвае старшыня камісіі па культуры і міжнацыянальных адносінах

Уліпені 2020 года пачаў работу Маладзёжны савет (парламент) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь, які з'яўляецца кансультатыўна-дарадчым органам і ажыццяўляе сваю дзейнасць на грамадскіх пачатках. Мэтай Маладзёжнага парламента з'яўляецца садзейнічанне дзейнасці Нацыянальнага сходу ў галіне заканадаўчага рэгулявання правоў і законных інтарэсаў моладзі. З таго часу прайшло больш як два гады, у жніўні 2022 года было сфарміравана другое скліканне парламента.

Работу Маладзёжнага савета сёння каардынуюць 10 камісій, яны супрацоўнічаюць з профільнымі камісіямі абедзвюх палат парламента. Мы пагутарылі са старшынёй камісіі па пытаннях культуры і міжнацыянальных адносін Станіславам ПАЗЮКОМ аб уключэнні моладзі на месцах у грамадскае жыццё і ролі Маладзёжнага парламента ў краіне.

— Станіслаў Сяргеевіч, вы ўзначальваеце камісію ўсяго паўгода. Як успрынялі навіну аб выпучэнні вашай кандыдатуры ад Віцебскага раённага Савета дэпутатаў?

— Вядома, гэта вялікі гонар, бо ад кожнага раёна і горада абласнога падпарадкавання (акрамя Мінска) у склад другога склікання ўвайшло ўсяго па адным прадстаўніку. Адразу ўсвядоміў высокую адказнасць і давер з боку мясцовых органаў улады, які мы з членамі камісіі стараемся апраўдваць у яркіх праектах і буйных мерапрыемствах.

— Старшынёй камісіі па справах культуры вас абралі невыпадкова — вы з'яўляецеся намеснікам дырэктара Віцебскага раённага цэнтра культуры і творчасці. Як атрымліваецца сумяшчаць работу, якая па сутнасці не абмяжоўваецца працоўным днём і не характарызуецца спакоем, з удзелам у Маладзёжным парламенце?

— Няпроста, але атрымліваецца. Са 138 дэлегатаў другога склікання — толькі двое студэнтаў. Такім чынам, практычна ўсе маем калегі займаюць кіруючыя пасады на месцах і сумяшчаюць асноўную работу з парламенцкай. Варта адзначыць, што раёны дэлегавалі самых дастойных кандыдатаў, якія актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці, таму цяпер у рамках работы камісій ніякіх праблем няма.

— Якую ролю іграе парламент ва ўключэнні моладзі ў грамадскае жыццё?

— З улікам таго, што гэта новая форма работы, якой усяго два гады, да канца ўнутраная сістэма маладзёжнага органа не адладжана. Нягледзячы на гэта, ужо можна назваць зацікаўленасць падрастаючага пакалення ў сур'ёзным удзеле ў жыцці краіны ў рамках праекта «Адзіны парламенцкі дзень» ва ўстановах адукацыі, мэтай якога з'яўляецца знаёмства з дзейнасцю МПНС, фарміраванне прававой культуры ў маладых людзей. Сёння існуе мноства маладзёжных саюзаў і арганізацый, дзе можна рэалізаваць свой інтэлектуальны і творчы патэнцыял, а калі тыя ж навыкі і ўменні можна прымяніць з карысцю для грамадства ў рамках Маладзёжнага парламента — гэта істотна матывуе падрастаючае пакаленне фарміраваць актыўную грамадзянскую пазіцыю і адчуваць прамы ўдзел у дзяржаўных працэсах.

— Раскажыце аб праведзенай рабоце за мінулы год і планах на 2023-і.

— Члены камісіі прынялі ўдзел у 55 мерапрыемствах, правялі — 45. Камісія ў сваёй рабоце абапіраецца на пытанні адстойвання нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, звязаных з захаваннем гістарычнай памяці, папярэджаннем спроб фальсіфікацыі гістарычных фактаў, а таксама з развіццём асветніцкай дзейнасці ў галіне культуры і мастацтва. Я рэгулярна прымаю ўдзел у цырымоніях перапахавання астанкаў савецкіх воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, апошняе мерапрыемства прайшло ў Віцебскім раёне. У рамках яго падрыхтоўкі з намеснікам старшыні Маладзёжнага парламента пры Дзяржаўнай Думе Расіі Аленай Яракінай мы арганізавалі сустрэчу «Аб культурным узаемадзеянні членаў Маладзёжных парламентаў Саюзнай дзяржавы». Да самага маладога дзяржаўнага свята — Дня народнага адзінства — члены камісіі правялі лёгкаатлетычныя забегі, гала-канцэрт «Адзін народ, адна Радзіма», узялі ўдзел у аўтапрабегу «За Беларусь!». Чатыры члены камісіі ўзялі ўдзел у патрыятычным форуме «Гэта НАША гісторыя!», пад кіраўніцтвам Уладзіміра Мішчанкі рэалізуецца праект-выстава «Гераічны летапіс Крычаўшчыны». У кастрычніку 2022 года Бажэна Ярэміч узяла ўдзел у добраўпарадкаванні мемарыяльнага комплексу «Хатынь».

Вядома, члены Маладзёжнага парламента не абыходзяць бокам рэспубліканскія акцыі «Нашы дзеці», «Ад усёй душы», «Збяром партфель першакласніку!». Важным кірункам работы з'яўляецца ўдзел у прамых тэлефонных лініях і выязных прыёмах, якія праводзяцца дэпутатамі і членамі Савета Рэспублікі — за паўгода мы прынялі ўдзел у трох прамых лініях і пяці прыёмах грамадзян.

Калі гаварыць пра планы на бягучы год, то ў лютым запускаецца новы сацыякультурны праект «Знакамітыя людзі суверэннай Беларусі», у сакавіку—ліпені адбудзецца цырымонія ўзнагароджання «Чалавек года Віцебшчыны», абласны фестываль вулічнага мастацтва «Волаты Прыдзвіння», Дзень моладзі на «Славянскім базары ў Віцебску». На стадыі падрыхтоўкі знаходзіцца цікавы праект «Школа маладога палітыка», які будзе рэалізаваны ва ўстановах адукацыі; мы прымаем удзел і ў падрыхтоўцы 30-га юбілейнага Дня беларускага пісьменства, які пройдзе ў верасні ў Гарадку. Члены камісіі па пытаннях культуры працуюць над напісаннем гімна Года міру і стварэння.

Нашы ініцыятывы знаходзяць важную падтрымку ў Савеце Рэспублікі, некаторыя з праектаў фінансуюцца. А мы ў сваю чаргу аналізуем запыты маладых людзей, сінтэзуем іх з сучаснымі тэндэнцыямі і нашым творчым патэнцыялам.

— Што для вас значыць работа ў Маладзёжным парламенце?

— Вялікая адказнасць і магчымасць папулярызацыі і прасоўвання дастойных культурных праектаў паўночнага рэгіёна на рэспубліканскай і міжнароднай арэне. Гэта цікавы вопыт і праверка на трываласць, а яшчэ — вялікі сацыяльны ліфт, таму што пасля работы на такім высокім узроўні перад табой адкрываюцца новыя перспектывы.

Гутарыла Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

У тэму

Парламенцкія аб'яднанні моладзі рэгіянальнага ўзроўню існуюць у Беларусі больш за 10 гадоў. Першай у 2007 годзе была створана маладзёжная палата пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў. На сёння аналагічных структур у розных гарадах краіны каля 60. Стварэнне Маладзёжнага рэспубліканскага парламента стала лагічным працягам. Ініцыятыва выходзіла ад прадстаўнікоў новага пакалення. У 2017 годзе на сустрэчы з навучэнцамі «Моладзь. Погляд у будучыню» пра яе расказалі Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку. Кіраўнік дзяржавы ідэю падтрымаў.

ДАРОГІ, ЭЛЕКТРААЦЯПЛЕННЕ, ПАЖАРНАЯ БЯСПЕКА

Штодзённыя клопаты аддаленага сельсавета

НЕВЯЛІКІ, кампактны Арэхаўскі сельсавет складаецца з шасці вёсак розных велічыні, размешчаны ў паўднёвай частцы Маларыцкага раёна, адметны цудоўнай прыродай, маляўнічым возерам. У сезон адпачынку, рыбалкі, грыбоў-ягад тут бывае шмат гасцей. І гэты фактар пасля найпершай задачы — забеспячэння належнага ўзроўню жыццядзейнасці людзей — улічваецца пры добраўпарадкаванні і падтрыманні знешняга выгляду тэрыторыі.

— Клопат любога кіраўніка мясцовай улады ў першую чаргу датычыць стану дарог, — гаворыць **старшыня Арэхаўскага сельскага Савета Святлана ВІТАНОЎСКАЯ.** — Добрая дарога, як вядома, азначае на прыступку вышэйшы ўзровень якасці жыцця кожнага вяскоўца. Дарога —гэта функцыянаванне ўстаноў адукацыі, медыцыны, пошты, ды і свае асабістыя машыны людзі не рамантуюць цяпер так часта, як раней. Калі з'явіўся асфальт сваякам і знаёмым стала прыемна прыязджаць да нас, гасцей сустракаць не сорамна. Побач возера, грыбныя, ягадныя мясціны — гараджане любяць сюды ездзіць.

Варта сказаць, што адным з самых значных праектаў па добраўпарадкаванні ў мінулай пяцігодцы ў Арэхаве стала будаўніцтва дарогі ад населенага пункта да шашы. Гэтыя тры кіламетры гравійкі былі праблемай, нагодай да скаргаў і сапсаванага настрою. Бо вясной, восенню, нават узімку дарогу вечна размывала. Людзі злаваліся, не раз пісалі ў розныя інстанцыі, у адказах іх прасілі пачакаць. Калі на пасаду старшыні абралі Святлану Вітаноўскую, да яе, як новага кіраўніка мясцовай улады, народ, як той казаў, паваліў валам, бо восенню 2016 года дарогу хоць чарговы раз падсыпалі, размыла.

Старшыня стукалася ва ўсе ўладныя дзверы і была пачутая. Участак дарогі ўключылі ў план будаўніцтва. І ўжо праз год на дарозе шчыравалі тэхніка і спецыялісты з Маларыцкага ДРБУ. Літаральна за месяц былую гравійку пакрылі асфальтам. Можна сказаць, што з той пары пачаўся новы адлік жыцця аграгарадка. Летась заасфальтавалі яшчэ адзін участак дарогі — ад Арэхава ў напрамку Піравога, Добрай і Дрочава. А сёлета работа па паляпшэнні мясцовых дарог працягнецца ў рамках падрыхтоўкі да дня вёскі. Зараз удакладняецца праграма, будуць заасфальтаваны асобныя вуліцы ў аграгарадку, пракладзены тратуары.

Другая па велічыні вёска сельсавета — Дрочава — нарэшце атрымала добрую мабільную сувязь. Яе яшчэ некалькі гадоў таму ў гэтым населеным пункце не было наогул. Потым адзін з аператараў паставіў вышку, але належнай якасці пакрыцця дасягнуць не ўдалося. Людзі зноў сталі скардзіцца. Пытанне на кантролі трымала і сенатар Тамара Шатлікава, якая рэгулярна бывае ў раёне па дэпутацкіх справах. Нарэшце спецыялісты аператара хібы выправілі, і вёска атрымала не толькі надзейную сувязь, але і хуткасны інтэрнэт.

Каля помніка ахвярам вайны ў Арэхаве.

Пытанне, якое найбольш хвалюе жыхароў вёскі зараз, — магчымасць электраацяплення дамоў. Газу ў Дрочаве няма, і людзі сталі звяртацца да кіраўніцтва сельсавета з просьбай паспрыяць у вырашэнні праблемы. Ужо ёсць заявы ад 25 гаспадароў на электрыфікацыю дамаўладанняў, якая прадугледжана Указам № 127. Для гэтага трэба памяняць лінію электрапередачы на сучасную. Работа стаіць у плане на бягучы год. Калі прыйдзе электраацяпленне, жыхары вёскі змогуць атрымаць выгоды, набліжаныя да гарадскіх.

— Кожны дзень прыносіць новыя клопаты, — разважае старшыня сельвыканкама. — Зараз на парадку дня — работа аглядных камісій, накіраваная на прафілактыку пажараў. Разам са спецыялістамі іншых зацікаўленых службаў наведваем домаўладанні грамадзян, правяраем стан праводкі і пячнога ацяплення, даём парады, выносім прадпісанні, нагадваем гарадскім дзецям пра абавязак паклапаціцца пра старых бацькоў. Асабліваю ўвагу ўдзяляем дамам, дзе жывуць састарэлыя, інваліды, адзінокія людзі, шматдзетныя сем'і. І варта сказаць, што пастаянная работа ў гэтым кірунку дае свае вынікі. Калі раней людзі не вельмі ахвотна ставілі апавяшчальнікі, асобных даводзілася літаральна ўгаворваць, то цяпер нават пытанняў не ўзнікае, мы прыходзім, і вяскоўцы паведамляюць, калі мянялі батарэі сілкавання ў апавяшчальніках.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Маларыцкі раён.

Алег ЯКУБЧЫК,
старшыня Маларыцкага раённага Савета дэпутатаў:

— У Арэхаўскім сельсавеце добра арганізавана работа з насельніцтвам у плане навядзення парадку. Праводзяцца суботнікі па азеляненні і добраўпарадкаванні, вясковая грамада правяла вялікую работу па паляпшэнні стану могілак. Рэгулярна ўкладваюцца дзяржаўныя сродкі ў развіццё тэрыторыі. У мінулым годзе, напрыклад, была ўведзена ў строй станцыя абезжалезвання вады ў Арэхаве, і вада стала лепшай якасці. У гэтым годзе работа па добраўпарадкаванні будзе працягнута.

ДАГЛЕДЖАНАЯ ПАМЯЦЬ

Старшыня сельвыканкама ўзнагароджаны ганаровым знакам «За асаблівы ўклад ва ўвекавечанне памяці абаронцаў Айчыны»

Для Андрэя Мацкевіча, які ўзначальвае Парэцкі сельвыканкам Гродзенскага раёна, гэта ўзнагарода асаблівая. Яна звязана з самымі знакавымі месцамі — помнікамі і мемарыяламі на тэрыторыі сельскага Савета, якіх тут пяць. Летась пад кіраўніцтвам старшыні ўсе месцы масавых пахаванняў Вялікай Айчыннай вайны адрамантаваны, а некаторыя набылі новы выгляд.

Ініцыятарам узнагароды стаў абласны ваенкамат, дзе пастаянна сочаць за станам помнікаў і абеліскаў. Як паведаміў **начальнік кірунку ідэалагічнай работы і сацыяльнай абароны ваеннага камісарыята Гродзенскай вобласці Віталь САДАВЕНКА,** менавіта ў Парэцкім сельсавеце выкананы найбольш значны аб'ём работ па аднаўленні памятных аб'ектаў. Пры гэтым адзначалася асабістая заслуга старшыні сельвыканкама.

— Гэта чалавек, які не толькі спадзяецца на фінансаванне з дзяржаўнай кішэні, але і сам ездзіць па сваіх нешматлікіх прадпрыемствах, шукае спонсараў, каб не толькі дзесьці падфарбаваць, а дасканала аднавіць аб'ект, — заўважыў прадстаўнік ваенкамата. — Вялікая работа праведзена па рэканструкцыі помніка ў вёсцы Бабіна, на месцы масавых расстрэлаў мірных жыхароў у гады вайны. Помнік стаіць амаль што ў лесе, там у вёсцы ўсяго 3-4 хаты, тым не менш, яго адрамантавалі, можна сказаць, зрабілі нанова. Прыемна, што чалавек з такой увагай ставіцца да гэтай тэмы.

— Помнік у вёсцы Бабіна патрабаваў даволі значнай рэканструкцыі, таму рашэнне аб яго аднаўленні прымалася на ўзроўні не толькі сельвыканкама, але і Гродзенскага райвыканкама. Былі выдаткаваны сродкі, агульны кошт склаў 11 тысяч рублёў. Усе работы вяліся па вызначанай працэдуры, згодна з аб'ёмамі, — зазначыў Андрэй Мацкевіч.

У выніку помнік не толькі адрамантавалі, а практычна адбудавалі: замянілі надмагільную пліту, паклалі плітку, зрабілі агароджу. Паколькі манумент знаходзіцца на ўзвышшы, былі ўсталяваны сходні, якіх раней не было. Сучасным штрыхом на мемарыяле стала металічная табліца з QR-кодам, дзе з дапамогай спецыяльнага дадатку можна атрымаць інфармацыю аб тым, што тут здарылася ў студзені 1943 года.

Дарэчы, поўную гісторыю тых падзей апісаў у сваёй кнізе «Мая родная вёска Бабіна» яе карэнны жыхар, навуковец, доктар філалагічных навук, прафесар Мікалай Данілавіч. Кніга выйшла ў свет у мінулым годзе невялікім накладам. Сам аўтар расказаў, што падчас карнай аперацыі фашысты забілі яго прадзеда і амаль усю яго сям'ю разам з іншымі вяскоўцамі, а вёску спалілі. Па словах Мікалая Данілавіча, яго матуля, якая вярнулася сюды пасля вайны, стала клапаціцца аб установоўцы помніка.

— Маці даглядала гэту брацкую магілу да апошніх дзён, купляла кветкі са сваёй пенсіі. Мы нават побач паставілі лаўку, на якой яна доўга сядзела вечарамі і малілася, — расказвае Мікалай Аляксандравіч. — Цяпер у вёсцы амаль

Фота Міхаіла ЛАПІНА.

нікога не засталося, але за помнікам ёсць нагляд. Летась яго значна аднавілі, дзякуючы старшыні Парэцкага сельвыканкама Андрэю Мацкевічу тут правялі дасканалы рамонт. Мясцовыя ўлады сочаць за парадкам, прыязджаюць траву падкошваць.

Паводле слоў старшыні сельвыканкама, за кожным помнікам замацаваны арганізацыі і навучальныя ўстановы.

— Мы з удзелам многіх службаў пастаянна аб'язджаем нашы памятныя месцы, сочым за іх станам, — расказвае Андрэй Мацкевіч. — Кожны год мы робім бягучы рамонт усіх помнікаў. Усе арганізацыі на тэрыторыі сельсавета ведаюць, што канкрэтна ім трэба зрабіць, мне нават нагадваць не трэба...

Андрэй Мацкевіч лічыць, што знак «За асаблівы ўклад ва ўвекавечанне памяці абаронцаў Айчыны» — гэта ўзнагарода не толькі яго, але і заслуга ўсяго раёна. Захаванню помнікаў і мемарыялаў надаецца вялікая ўвага. У пачатку года сумесна з раённым Саветам дэпутатаў плануецца работа па аднаўленні помнікаў, згодна з дзяржаўнай праграмай.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by **(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.631. **Нумар падпісаны ў 19.30 31 студзеня 2023 года.**

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Наименование объекта	**Изолированное помещение № 100/D-105703**
Место-расположение объекта	**г. Брест, пр-т Машерова, 80-164а**
Продавец объекта	ОАО «АСБ Беларусбанк»
Организатор торгов	Брестское областное управление № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк»
Общая площадь здания	206 кв. м
Начальная цена продажи с учетом НДС	234 970,21 руб. (двести тридцать четыре тысячи девятьсот семьдесят руб. 21 коп.)
Сумма задатка	20 000 руб. (двадцать тысяч руб. 00 коп.)
Информация о земельном участке	-
Характеристика объекта	Изолированное помещение, расположенное на 1-м этаже 9-этажного многоквартирного жилого дома, водоснабжение, электроснабжение, центральное отопление
Условия оплаты	По договоренности победителя аукциона с собственником имущества

Аукцион состоится 13 марта 2023 года в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, актовый зал на 9-м этаже.

Документы для участия в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Московская, 202, каб. 409 до 16.00 09 марта 2023 года.

Для участия в аукционе к моменту подачи документов необходимо внести задаток на р/с BY69AKBB66708590700002000000, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНН 100325912.

Если на участие в аукционе подана только одна заявка, то объект продается этому участнику (с его согласия) по начальной цене, увеличенной на 5 %. Договор купли-продажи заключается в течение 30 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Контактный тел. (80162) 277518.

Обязательным условием аукциона является заключение победителем торгов либо единственным участником, изъявившим готовность приобрести реализуемое изолированное помещение, договора по приобретению имущества (основные средства: кондиционер, роллеты защитные и ворота гаражные) общей стоимостью 796,80 (семьсот девяносто шесть рублей 80 копеек) с учетом НДС, предназначенного для эксплуатации отчуждаемого объекта недвижимости.

Договор купли-продажи недвижимого имущества заключается и регистрируются в РУП «Брестское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Открытый аукцион проводится путем пошагового увеличения цены. Шаг аукциона – 5 % от предыдущей названной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Затраты по оформлению документов по сделке производятся за счет покупателя.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 рабочих дней со дня проведения открытого аукциона.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Сукно», г. Минск, ул. Матусевича, д. 33. Тел. +375 (17) 363-99-40

Извещение о проведении четвертого повторного открытого аукциона	Дата, время проведения аукциона	Срок подачи заявления на участие в торгах
Предмет аукциона: Имущество в количестве 53 лотов (бывшее в употреблении), **по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33.** Полный состав имущества размещен на сайте организатора аукциона www.cpo.by	**21.02.2023 в 13.00**	**с 9.00 01.02.2023 до 17.00 17.02.2023**

Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяются ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

Срок подписания договора купли-продажи	**5 (пять) рабочих дней** после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **10 (десять) дней** со дня проведения аукциона, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере от 1 до 10 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов не менее чем за день до наступления даты проведения торгов без объяснения причин снятия

Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «РАЙБЫТУСЛУГИ» г. Калинковичи – в лице ликвидатора, извещает о проведении 17 февраля 2023 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 20 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Изолированное помещение с инв. № 333/D-46321**, площадью **887,9 кв. м**, назначение – помещение коммунального хозяйства, наименование – **коммунально-бытовое помещение, находящееся на 1–3 этаже**. **Адрес:** Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Фрунзе, 3-1. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **323250100002002684** общей площадью **0,1118 га** – для обслуживания производственного здания со встроенным помещением финансового назначения (для размещения объектов бытового обслуживания населения). **Право постоянного пользования (доля в праве 23/25).** Местоположение: Гомельская обл., Калинковичский р-н, г. Калинковичи, ул. Фрунзе, 3. **В состав лота входит:** оборудование и инвентарь к количестве 405 ед. **Обременение:** договор аренды	**745 600,00**	**74 560,00**

Продавец: Открытое акционерное общество «Райбытуслуги» г. Калинковичи. 247710, Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Фрунзе, 3.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 690-00-10 – ликвидатор Беланов Руслан Николаевич.**

Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 1 февраля 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 15 февраля 2023 г. в 16.00 включительно.

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в сроки согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 18.11.2022 г. № 227 (29849).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.

ООО «Аукцион Сервис» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА (ВТОРОГО ПОВТОРНОГО) по продаже недвижимого и движимого имущества, принадлежащего ООО «ФорестФактор»

Лот, №	Наименование имущества	Начальная цена лота без учета НДС, руб.	Задаток 10 %, руб.	Шаг аукциона 5 %, руб.
1	2	4	6	8
1	Общий производственный склад (кап. строение с инв. № 342/С-67987 (наименование – здание производственного корпуса с АБК; назначение – здание специализированное, для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель) общ. пл. 7668,7 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 325057000001000054, по адресу: Гомельская обл., Светлогорский р-н, Сосновоборский с/с, рп. Сосновый бор, ул. Заводская, 4)	821 400,00	82 140,00	41 070
2	Погрузчик фронтальный одноковшов. VOLVO BM, рег. знак ЕК-3 5572, зав. № 4448, г. в. 1986	11 700,00	1 170,00	585,00
3	Автобус RAF 220301, рег. знак АМ 3973-3	1 560,00	156,00	78,00
4	Автобус GAZ-32213 414, рег. знак АМ 1926-3, г. в. 2007/2	1 620,00	162,00	81,00
5	Автомобиль GAZ-2705, рег. знак АМ 1927-3	2 100,00	210,00	105,00
6	Автомобиль MAZ А3 322, рег. знак АМ 1901-3	4 740,00	474,00	237,00
7	Козловой кран КК-0-12,5, инв. № 240. Рельс подкрановый	18 300,00	1 830,00	915,00
8	Полуприцеп MAZ 938660 026, рег. знак А 2793 В-3	1 980,00	198,00	99,00
9	Автомобиль MAZ 631708, рег. знак АМ 3371-3	34 800,00	3 480,00	1740,00
10	Автомобиль MAZ 837810-22 0, рег. знак А 3943 В-3	3 180,00	318,00	159,00

Срок подачи заявления на участие в аукционе	Заявление принимается с момента выхода настоящего объявления до **16.00 09.02.2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5, к. 1
Дата, время, место проведения аукциона	**10 февраля 2023 года в 14.00** по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5, к. 1
Номер р/с для перечисления задатка	р/с BY59BELB30121325500020226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 491066041. Задаток перечисляется до **09.02.2023 г. до 16.00** (включительно)
Условия реализации	Объекты продаются в собственность без условий
Место расположения имущества	Гомельская обл., Светлогорский р-н, Сосновоборский с/с, рп. Сосновый бор, ул. Заводская, 4 и г. Речица, ул. Энергетиков, 1Д

Победитель торгов обязан в день проведения торгов подписать протокол о результатах торгов. Заключить договор купли-продажи в течение 5 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретенное имущество в течение 20 календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лотов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Победитель аукциона в течение 5 календарных дней после проведения аукциона обязан возместить затраты, связанные с организацией и проведением аукционных торгов, а также оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 5 % от конечной цены предмета торгов по лотам №№ 2–10, и 3 % по лоту № 1. Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность. Организатор торгов имеет право снять имущество с торгов не позднее чем за пять дней до их проведения (до 04.02.2023 г. включительно). Первоначальные объявления размещены в газете «Звязда» 1-й аукцион – 30.11.2022 г., 2-й аукцион – 18.01.2023 г.

Условия аукциона:

- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;

- на Покупателя возлагаются расходы, понесенные организатором торгов при проведении торгов по продаже имущества должника, в том числе оплата размещения сведений о торгах в СМИ;

- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ, демонтажа;

- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в РУП «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру», ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

Организатором торгов является ООО «Аукцион Сервис» (адрес: г. Гомель, ул. Барыкина, 240, к. б/н). По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: 8-044-767-88-05, 8-044-736-75-70, факс 8-0232-21-09-65.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Карысна ведаць

Пуд ёду з соллю

Ёд адносіцца да аднаго з найважнейшых мікраэлементаў, без якіх не можа абысціся чалавечы арганізм. Пастаянны яго недахоп небяспечны рознымі сур'ёзнымі захворваннямі шчытападобнай залозы, органаў стрававання і здольны нават уплываць на разумовае развіццё некалькіх пакаленняў запар. Пры рэгулярным ужыванні ў ежу ёдаваная соль дапамагае паступова папоўніць запас гэтага мікраэлемента, які мае ўласцівасць назапашвацца ў арганізме. Калі ўключыць яе ў свой пастаянны рацыён, то можна цалкам вырашыць праблему ёдадэфіцыту.

Навошта нам ёд?

— Ёд з'яўляецца жыццёва неабходным рэчывам для нашага арганізма. Гэты мікраэлемент патрэбны для правільнага функцыянавання шчытападобнай залозы, якая выпрацоўвае тырэоідныя гармоны, што адказваюць за эфектыўнасць абменных працэсаў, за развіццё і рост. У арганізме ўтрымліваецца ад 20 да 50 мг ёду, з іх не менш за 60 % засяроджана ў шчытападобнай залозе, 40 % — у мышцах, печані, нырках, скуры, крыві, — расказвае **ўрач-лабарант Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Марыя ШПАТАКОЎСКАЯ.**

У прыватнасці, ёд у арганізме прымае ўдзел у рэгуляцыі энергетычнага абмену, тэмпературы цела, хуткасці біяхімічных рэакцый, абмену бялкоў, тлушчаў, водна-электралітнага абмену, метабалізму шэрагу вітамінаў, працэсаў росту і развіцці арганізма, уключаючы нервова-псіхічнае развіццё.

Чым небяспечны дэфіцыт?

Сусветная арганізацыя аховы здароўя прызнала глабальнай праблему захворванняў, якія ўзнікаюць з-за дэфіцыту ёду ў рацыёне харчавання. Статыстычныя даныя сведчаць аб тым, што ад недахопу ёду ў свеце пакутуе прыкладна 200 мільёнаў чалавек. Як правіла, у зонах пражывання большасці такіх хворых назіраецца недастатковасць ёду ў аб'ектах навакольнага асяроддзя. Ёдадэфіцыт у нашым рэгіёне не навіна, паколькі глебы Беларусі практычна паўсюдна бедныя ёдам.

— Самыя распаўсюджаныя ёдадэфіцытныя захворванні — гэта дыфузны нетаксічны валляк, вузлавы і шматвузлавы валляк, ёдадэфіцытны гіпатырэоз, інтэлектуальныя парушэнні, — пералічвае ўрач. — Ёд паступае ў арганізм з харчовымі прадуктамі і вадой. Асабліва багатыя на ёд марскія прадукты — рыба, рыбін тлушч, марская капуста, крэветкі, кальмары. Добрай крыніцай ёду з'яўляюцца малочныя прадукты, яйкі, ялавічная печань, проса, грэцкія крупы, бульба, некаторая гародніна і садавіна (напрыклад, морква, цыбуля, бурак, шчаўе, белакачанная капуста). Аднак падчас варкі мяса і рыбы губляецца палова ёду, пры кіпячэнні малака — яго чацвёртая частка.

Чым карысная ёдаваная соль?

Адным з альтэрнатыўных рашэнняў папаўнення дэфіцыту ёду ў арганізме, як вядома, з'яўляецца ўжыванне ёдаванай солі. Чаму ёдам узбагачаюць менавіта соль?

— Уся справа ў тым, што соль у малой, але пастаяннай колькасці штодня ўжываюць усе. Даследчыкі спасылаліся на тое, што ўзбагачаная і насычаная ёдам соль можа папоўніць неабходныя запасы ёду ў арганізме чалавека, дапаможа папярэдзіць развіццё захворванняў, звязаных з недахопам ёду, — тлумачыць Марыя Шпатакоўская.

Што ж сабой уяўляе ёдаваная соль? Харчовая ёдаваная соль — гэта разнавіднасць харчовай кухоннай солі, у саставе якой змяшчаецца ёдыд калію, ёдат калію, ёдыд натрыю і ёдат натрыю. Выкарыстанне любога з пералічаных злучэнняў залежыць ад кампаніі-вытворцы. Пры рэгулярным ужыванні ў ежу ёдаваная соль дапамагае паступова папоўніць запас незаменнага мікраэлемента.

Ці можа ёд «выпарыцца»?

Улічваючы, што традыцыйна мы спажываем больш солі, чым рэкамендавана, абсалютна дарэчы асцерагацца перадазіроўкі. Варта памятаць: нельга ўжываць бескантрольна ёдаваную соль роўна, як і звычайную харчовую не ёдаваную соль, дадаючы яе ва ўсе прыгатаваныя стравы ў вялікай колькасці. Перавышэнне норм спажывання ёду можа выклікаць негатыўныя з'явы.

Ці можа ёд, папросту кажучы, «выпарыцца» з солі? Так, таму, купляючы і захоўваючы прадукт, варта правяраць тэрмін яго прыдатнасці. Карысць ёдаванай солі мае месца толькі ў перыяд тэрміну яе прыдатнасці, а пасля яго заканчэння соль можа прымяняцца як звычайная харчовая, бо сама соль не мае тэрміну прыдатнасці, а вось дабаўка ёду з часам губляе свае карысныя ўласцівасці.

Скажыце, доктар...

МАРОЗ І СЭРЦА: ШТО ТАКОЕ ХАЛАДОВЫ ІНФАРКТ?

Зімой, асабліва ў моцныя маразы і ветранае надвор'е, павышаецца рызыка сардэчнага прыступу, які называюць халадовым інфарктам. Каму ён пагражае і як яго пазбегнуць? Пра гэта расказала ўрач-тэрапеўт, загадчык аддзялення прафілактыкі 11-й гарадской паліклінікі Мінска Святлана ЯНУШКА.

— Святлана Аляксандраўна, расскажыце, што такое халадовы інфаркт?

— Пад халадовай стэнакардыяй (інфарктам) разумеюць прыступ загрудзінных болеў, які здараецца пры рэзкім перападзе тэмпературы. Узнікае ён з-за спазмы сасудаў, напрыклад у раёне канечнасцяў. Пры гэтым рэзка павялічваецца нагрузка на сэрца і можа развіцца рэфлекторная спазма сасудаў, якая пагоршыць кровазабеспячэнне галоўнай сардэчнай мышцы — міякарда. Не выключаецца развіццё нават паўнацэннага інфаркту.

— Калі і пры якіх абставінах гэта можа здарыцца?

— Часцей за ўсё праблема адзначаецца, калі чалавек выходзіць з цёплага памяшкання на вуліцу пры марозе. Найбольш часта такі інфаркт узнікае пасля моцных псіхаэмацыянальных перажыванняў, а таксама ў курцоў. У такіх людзей парушана работа вегетатыўнай нервовай сістэмы, што і з'яўляецца прычынай хваробы.

— У якіх выпадках гэта небяспечна і варта звяртацца да ўрача?

— Калі пры выхадзе на мароз ці, наадварот, пры заходзе ў цёплае памяшканне пасля марозу ўзнікаюць боль і дыскамфорт у грудной клетцы, то гэта нагода звярнуцца да ўрача. Ён прызначыць ЭКГ, аналізы, нагрузачны стрэс-тэст і халадовую пробу, падчас якой рукі пацыента апускаюць у халодную ваду і сочаць за рэакцыяй сэрца на ЭКГ.

— Ці можна неяк загартаваць свой арганізм, каб пазбегнуць халадовай стэнакардыі? Якія меры яе прафілактыкі?

— У якасці прафілактыкі інфаркту неабходна весці здаровы лад жыцця: паўнацэнна харчавацца, памятаць аб фізічнай актыўнасці, пазбягаць стрэсаў. Акрамя таго, пазбягаць рэзкіх перападаў тэмпературы, насіць цёплае адзенне па сезоне, выкарыстоўваць шалік і пальчаткі.

Смачна есці!

Прадукт, які ратуе ад стрэсу

Вядома, што бананы паляпшаюць памяць, пазбаўляюць ад стрэсу і ацёкаў. Але ці праўда, што да нас даязджаюць толькі кармавыя бананы і закансерваваныя «хімозай»? Навошта бананы тэстуюць на радыеактыўнасць? І колькі ў іх атрутных пестыцыдаў?



У ЧЫМ КАРЫСЦЬ

У банана імідж чэмпіёна па колькасці калію, які каштоўны тым, што дапамагае выводзіць з арганізма лішнюю вадкасць. Калі гэтага макраэлемента не хапае, перагружаныя вадой сэрца, печань, ныркі ацякаюць. У ста грамах жоўтых бананаў трыста пяцьдзясят міліграмаў калію. А ў той жа колькасці чырвоных — ужо чатырыста. Аднак сутачная норма амаль у дзесяць разоў большая — 3500 міліграмаў калію. Значыць, і тыя, і іншыя бананы трэба есці кілаграмамі, каб атрымаць неабходную дозу макраэлемента.

Рэкорд банана з лёгкасцю б'юць капуста, вінаград, мандарыны, апельсіны, гарох і нават бульба, прыгатаваная ў мундзіры. Акрамя таго, гэты калій складаецца з трох ізатопаў (калій-39, калій-40, калій-41), адзін з якіх (калій-40) — радыеактыўны. Аднак і ў бананах, і ў іншых прадуктах, багатых на калій, гэты ізатоп складае тысячную долю працэнта.

Галоўнай карысцю бананаў дыетолагі называюць іх здольнасць павышаць настрой за кошт павелічэння колькасці сератаніну ў крыві. Прычым самыя радуючыя бананы — саспелыя, салодкія. Хоць у злёгку недаспелых таксама ёсць бонус. У іх застаецца больш асаблівага крухмалу, які не паспеў расклясціся на простыя вугляводы. Смаку ў гэтага крухмалу амаль няма. Затое ён, як высветлілася нядаўна, вельмі падабаецца стрававальным бактэрыям. А значыць, гэта і клятчатка, і прэбіётык.

ЯК БАНАНЫ ДАБІРАЮЦЦА ДА НАС

Зялёныя бананы многія лічаць яшчэ і больш бяспечнымі: нібыта ў іх менш таксічных газаў, якімі іх апрацоўваюць, каб тыя штучна даспелі на чужыне. Бо на радзіме бананаў у Эквадоры іх спецыяльна зразаюць строга на дванаццатым тыдні росту, калі яны дасягаюць патрэбнага памеру, але ўнутры іх яшчэ не запусціўся працэс саспявання. У той жа дзень бананы аказваюцца на борце спецыяльнага карабля-халадзільніка. Наступны месяц яны плывуць па моры, адкуль «перасаджваюцца» ў грузавікі-рэфрыжэратары.

Пасля дарогі першыя дванаццаць гадзін бананы адаграваюцца. Магутныя вентылятары разганяюць тэмпературу да +19. А затым у камеру пускаюць бананагаз.

Бананагаз — гэта сумесь азоту (95 %), які ні на што не ўплывае, пры гэтым запавольваючы псаванне, з этыленам (5 %). А вось ён вельмі гаручы і звычайна ўжываецца пры вырабе поліэтылену. А яшчэ аказвае наркатычнае ўздзеянне. Аднак этылен расліны вылучаюць і самі, і для чалавека ён бясшкодны ў звычайных прыродных канцэнтрацыях. Да таго ж, у прамысловай газавай камеры ўсё разлічана, і бананы роўна суткі знаходзяцца ў этыленавым воблаку, а наступныя пяць дзён ветрацца і даходзяць да кандыцыі.

ЯКОЙ ХІМІЯЙ АПРАЦОЎВАЮЦЬ

Апасацца ў бананах варта сельскагаспадарчых хімікатаў, адзначаюць эксперты. Апошнія дзевяць гадоў на бананавыя плантацыі наступае і асабліва інтэнсіўна іх пажырае плесневы грыбок-кілер. У адчайных спробах выратаваць ураджай плантатары заліваюць яго ядамі.

Ад гэтага церпяць жыхары бліжэйшых да плантацый дамоў. Іх здароўе бывае падарвана. Аднак бананы на плантацыі добра абараняюць. Як толькі завязалася гронка, яе ўкрываюць пакетам, які не дае патрапіць «хімозе» на плод. Пасля зразання бананы на плантацыі старанна мыюць. Так што рызыка купіць бананы з перадозам пестыцыдаў мінімальная, сцвярджаюць эксперты.

Ці варта траціцца на арганічныя бананы? Магчыма, яны больш «чыстыя»? Насамрэч браць можна любыя бюджэтныя, бо карысных рэчываў, і ў тым ліку амінакіслаты трыптафану, якая ператвараецца ў арганізме ў гармон радасці, чаго многім сёння не хапае, ва ўсіх бананах аднолькава шмат.

КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Галіна Пярун піша прозу для дзяцей і дарослых. Нядаўна ў яе выйшла кніга аповесцяў, казак для малодшых школьнікаў. Мінулы год быў ураджайны для маладой пісьменніцы на перамогі ў літаратурных конкурсах. Яна стала адной з пераможцаў Рэспубліканскага літаратурнага стартапа LitUP, а яе эсэ, прысвечанае беларускім жанчынам, заваявала трэцяе месца ў конкурсе СПБ і часопіса «Алеся».
Апавяданне «Ціхія слёзы маці» таксама пра жанчыну. Сапраўды, у бальнічных палатах, пра якія расказвае пісьменніца, жыццё цячэ нягучна. Размовы напаўголасу, чаканне вердыкту дактароў і ціхі мацярынскі подзвіг. Ціхі, то-бок незаўважны ён для здаровых людзей, якія недзе побач, але нібыта ў другім сусвеце. Гэты факт — паралельнае існаванне Святланы — Галіна Пярун паказвае праз выразную дэталь: пах чаромхі здзіўляе жанчыну, бо для яе час спыніўся зімой, калі захварэла яе дзіця. Такіх убачаных пісьменніцай дэталяў, фактаў у апавяданні багата; менавіта праз іх, а не праз гучныя дэкларацыі, якія не заўсёды дарэчы ў мастацкім творы, аўтар імкнецца раскрыць важную тэму.

Алена БРАВА.

Галіна ПЯРУН

ЦІХІЯ СЛЁЗЫ МАЦІ

НЕВЯЛІКІМІ крокамі Святлана мерала аўтобусны прыпынак. Яна то спынялася на некалькі хвілін, то выходзіла на дарогу і ўглядалася ў паварот. Вось-вось пакажацца доўгачаканы транспарт, але, як назло, нічога не было.

Сэрца гучна тахкала ў грудзях. Яна не магла супакоіцца і зноў пачынала хадзіць туды-сюды. Раз за разам выцягвала гадзіннік і зноў клала яго ў сумку. Людзі, што стаялі побач, пачыналі ўжо звяртаць на яе ўвагу. Святлана нават злавіла на сабе некалькі зацікаўленых позіркаў. Усхваляваная, яна не адразу адчула цеплыню веснавога сонца, якое ўжо добра прыпякала ў плечы. А гарэзлівы ветрык развяваў ёе спадніцу, нібыта намерваўся падхапіць жанчыну і панесці куды-небудзь у свет.

Святлана падставіла твар сонейку. Цёплае паветра пяшчотна абдымала яе з усіх бакоў. Аднекуль даносіўся знаёмы салодкі пах — чаромха! Жанчына здзіўлена паглядзела на белыя кветкі, зялёнае лісце і сакавітую траву. Калі толькі ўсё паспела распусціцца? А яна зусім не заўважыла. Здаецца, толькі ўчора ляжаў снег. Вось цяпер ёй стала ясна, чаму яе так пільна разглядаюць. Уся справа ў тым, што яна занадта цёпла апранутая. Не было часу нават падумаць пра гэта.

Яна кінула кароткі позірк на лёгка апранутых жанчын і ўздыхнула. Цяпер яе няма ў гэтым жыцці, што віруе навокал. Яе жыццё — гэта маленькая дачка Каця. Усе думкі, усе пачуцці, сэрца і душа знаходзяцца побач з самым каштоўным, што толькі можа быць на свеце, — родным дзіцем. Вось бы некалькі галінак чаромхі адламаць для Каці! Якая вялікая радасць была б! Святлана нават уявіла сабе, як успыхнулі б вочы малой. Але нельга гэтага рабіць. На жаль, туды, дзе знаходзіцца яе дачка, кветкі прыносіць няможна, зрэшты, як і многае іншае. Ужо некалькі доўгіх месяцаў дзяўчынка на лячэнні ў аддзяленні гематалогіі. Амаль столькі ж яна не была на вуліцы. Аддзяленне лякарні стала яе домам.

У сваім горы яны не адны такія. Многія маці вымушаны з-за хваробы малых знаходзіцца тут гадамі. Дзеці прымаюць працяглыя і нялёгкія курсы хіміятэрапіі, часам прамянёвай. Раней Святлана нават не ведала, што такія хворыя дзеці ёсць у іх горадзе. Але ж яны сапраўды ёсць — хлопчыкі і дзяўчынкі, маленькія і не вельмі.

Маскі, маскі, навокал усе ў медыцынскіх масках, і табе робіцца нікавата ад адной думкі, што ты можаш нашкодзіць гэтым маленькім пацыентам толькі адной сваёй прысутнасцю. Спачатку было неяк дзіўна глядзець на сумных дзяцей і зусім спакойных маці. Амаль усе малыя з безвалосымі галоўкамі, мармуровай бледнай скурай, аж кожная жылка відна. Жанчыны паводзілі сябе так, быццам нічога не здарылася, гулялі з дзецьмі, усміхаліся ім і наогул былі ветлівымі, але немнагаслоўнымі. Як можна быць такімі спакойнымі! Напачатку Святлана абуралася, гледзячы на іх. І толькі потым усё зразумела. Абрынуўся свет і для іх. Калі сцісхала аддзяленне, жанчыны выходзілі са сваіх палат, каб даць волю пачуццям. Галасілі адна ў другой на плячы і да крыві кусалі вусны, стрымліваючы рыданні. Бо дзеці не павінны чуць, як галосяць маці. Ні адна рыса твару не павінна выдаць стан душы. Яны дужыя, і ў іх усё атрымаецца. Колькі намаганняў трэба, каб паглядзець дзіцяці ў вочы. Бачыць, як тухнуць там агеньчыкі жыцця, усміхацца і казаць, што хвароба адступіць.

Урачы сталі за гэты час самымі роднымі людзьмі. Толькі на іх уся надзея. Нікому не перадаць, як замірае сэрца ў грудзях, калі ловіш кожнае слова, якое злятае з іх вуснаў. І як страшна ад гэтых слоў. Зноў і зноў у думках гучыць: «Прагноз неспрыяльны». Святлана адмаўляецца ў гэта верыць. Не можа такога быць з яе Кацярынай! Яна абавязкова паправіцца. Толькі патрэбен час. Жанчына гоніць дрэнныя думкі прэч. Колькі дзяцей з ракам крыві пайшло на папраўку. І ў іх з Кацярынай атрымаецца. Інакш не павінна быць.

У Святланы, акрамя дачкі, нікога няма на гэтым свеце. Ніводнай роднай душы. Сама з дзіцячага дома. А хто бацькі, так, магчыма, і застанецца таямніцай. Кінулі яе яшчэ ў радзільні. Пэўна, пабаяліся, што адна ножка карацейшая за другую. Так і выхавалася дзяўчына на дзяржаўных харчах, не ведаючы, хто яна і адкуль. Прыгожая, светлавалосая, з правільнымі рысамі твару і блакітнымі бяздоннымі вачамі. Многія хлопцы, здаецца, там і ўтапіліся б. Кульгавасць адпуджвала. Не лёс быў Святлане выйсці замуж. Мусіць, і не спазнала б радасць мацярынства, калі б адноўчы не давялося ёй ехаць у аўтобусе з адной немаладой кабетай. Тая падзівілася прыгажосці і няўдаламу жыццю жанчыны. А на развітанне параіла нарадзіць дзіця, пакуль яшчэ не позна, падараваць яму ўсю сваю любоў. Святлана толькі рассмяялася з гэтых слоў. Уздыхнула і дадала, што для гэтага патрэбен хоць які-небудзь мужчына.

Старая дала адрас санаторыя. І Святлана выкарыстала свой апошні шанц. Назбірала грошай, накупіла прыгожых сукенак і паехала на адпачынак. Амаль два тыдні змарнавала на пошук прыгожага мужчыны — не драбязніцца ж! І ў адзін з дзён набралася храбрасці, пайшла заваёўваць сэрца незнаёмца. Далікатнай і сціплай, толькі адной ёй было вядома, што тварылася ў яе душы і чаго гэта каштавала. Фартуна ўзнагародзіла яе хваляванні і сорам. Праз тры месяцы Святлана адчула прыемныя штуршкі ў жываце. Гэта адчуванне ні з чым не параўнаць! Ты ведаеш, што недзе там, побач з тваім сэрцам, б'ецца яшчэ адно, зусім маленькае, і яно — часцінка цябе. Праз дзевяць месяцаў з'явілася Каця. Святлана радавалася, што дзяўчынка здаровая. Цяпер яна самая шчаслівая на свеце! Быць маці — як гэта цудоўна! Спачатку ты цалуеш маленькі камячок і шэпчаш ласкавыя словы, потым цябе абдымаюць мяккія дзіцячыя далонькі, а маленькія вусны кажуць, што ты самая лепшая і самая прыгожая ў свеце. Самая прыгожая... Кацярына часта казала ёй: «Мамачка, ты мая самая лепшая! Я так цябе люблю! Калі вырасту, абавязкова стану ўрачом і вылечу тваю хворую нагу. Ты будзеш хутка, хутка бегаць, я нават цябе не змагу дагнаць».

Цяпер Кацярына яшчэ часцей выказвае жаданне стаць урачом, каб лячыць хворых, такіх, як яна. Яе не па-дзіцячаму сумныя разважанні часам палохаюць маці. Святлана не гаворыць дачцэ ўсю праўду пра хваробу. Стараецца хоць чымсьці адцягнуць увагу ад непрыемнага. Палохае і здзіўляе тое, што дзяўчынка сама пра ўсё здагадваецца. Апошнім часам яна пасябравала са сваёй аднагодкай з суседняй палаты. У тыя хвіліны, што яны бачыліся, дзяўчаткі абменьваліся ўспамінамі свайго нядаўняга жыцця. Далі адна адной тэлефоны і адрасы, марылі аб сустрэчы пасля лякарні. І раптам усё скончылася. Дзяўчынкі-суседкі не стала.

У адну з раніц Святлана ўбачыла, як з палаты выкацілі каталку, накрытую прасцінай. Счарнелая ад гора маці бязгучна плакала. Святлана доўга не магла зрушыцца з месца, а потым пайсці да дачкі, паглядзець ёй у вочы. Яна забараніла што-небудзь гаварыць усім, хто мог незнарок прабалбатацца пра дзяўчынку з суседняй палаты, але Каця сама спытала:

— Мамачка, чаму ты мне нічога не гаворыш аб Ірыне?

— Не ведаю, — ледзь выдавіла з сябе Святлана, баючыся голасам выдаць сябе. — Напэўна, іх з маці выпісалі дамоў.

— Яна абавязкова зайшла б да мяне, бо абяцала, — спакойна адказала дачка, пасля некаторай паўзы. — Ты мне хлусіш. Я ведаю, што Ірына памерла. Яе больш няма. Я таксама памру?

— Ну што ты! Такое не трэба гаварыць. Нельга так думаць! — Святлана ўпершыню пры дачцэ не стрымалася і заплакала.

— Мамачка, не плач! Я не хачу, каб ты плакала!

Яна прыхінулася да матчыных грудзей і заціхла. Святлана стрымлівала сябе, але слёзы душылі яе.

Кацярына тады ўвесь дзень маўчала. Глядзела некуды ў нябесную бездань праз шкло і пра нешта думала.

Пад вечар зноў пачалася гарачка, і дзяўчынка ўпала ў бяспамяцтва. Яна цяжка дыхала і ляжала нерухома. Святлана нават на адлегласці адчувала цяпло яе цела. Яна прыкладала мокры ручнік да лба дачкі, абцірала яе, гладзіла безвалосую галаву дзяўчынкі і ўспамінала, як яна перажывала, калі страціла свае доўгія косы. Каб Каці не было сумна расставацца са сваімі кучарамі, Святлана таксама падрэзала валасы. Гэта ўразіла дзяўчынку. Яна нават ціха рассмяялася і сказала, каб маці болей так не рабіла, бо ёй так зусім не прыгожа.

Павекі сталі цяжкімі: Святлана трымалася да апошняга, але здалася. Пяць хвілін сну, а жанчыне здалося, што прапусціла нешта важнае. На сцяне забегалі першыя промні сонейка, віднела. Яна ціха паправіла коўдру і дакранулася да лба дачкі. Гарачка не спала. Святлана цяжка ўздыхнула і хацела ўжо ўстаць, каб каго-небудзь паклікаць.

— Мамачка, я не сплю, — расплюшчыла вочы Каця. — Не хвалюйся. Мне крыху лепей. Сон прысніўся. Гэта быў дзіўны сад, там раслі кветкі, лёталі матылькі, спявалі птушкі. Здаецца, калі б я трапіла туды, то абавязкова паправілася б. Я хачу на двор, хачу дахаты. У кватэры мае цацкі. Яны, мабыць, сумуюць па мне. Вельмі хачу іх убачыць. Ты памятаеш майго мядзведзя? Напэўна, ён крыўдзіцца на мяне і думае, што я яго кінула.

— Не крыўдзіцца. Ён усё разумее і чакае цябе.

Святлана добра памятала гэтага мядзведзя. Калі Каця ішла першы раз ў дзіцячы садок, яна плакала і не хацела там заставацца адна. Жанчына спынілася каля крамкі, каб купіць насоўку і выцерці слёзы малой, і нечакана справа вырашылася сама сабой. Убачыўшы ў вітрыне прыгожага блакітнага мядзведзя, дзяўчынка нерашуча папрасіла яго купіць, а за гэта паабяцала добра сябе паводзіць. І сапраўды, цацка дапамагла. Каця не расставалася з ёй ніколі. Нават калі пайшла ў першы клас, разам з ёй «рабіў урокі» мядзведзь.

— Прывязі яго сюды. Мне шкада, што ён там дома адзін. Я памру, а мае цацкі застануцца. Застануцца мае кніжкі, мае сукенкі. Што з імі будзе? Вось Іры больш няма, а яе падарунак застаўся, — яна раскрыла далонь і паказала ляльку памерам з фасоліну.

Святлана не магла вымавіць ніводнага слова. Вялікіх намаганняў каштавала не расплакацца.

— Ты ж ведаеш, цацкі прыносіць сюды нельга, — яна старалася не глядзець дачцэ ў вочы.

— Мамачка, я вельмі цябе прашу. Мы яе схаваем, і ніхто не заўважыць.

Дзяўчынка была няўмольная, і Святлана вырашыла ехаць дамоў. Лёгка сказаць — «ніхто не заўважыць». Мядзведзь з цяжкасцю змяшчаўся ў пакеце. Як яго пранесці ў палату? Аб гэтым думала Святлана, калі чакала на прыпынку аўтобуса. Салодкі пах чаромхі па-ранейшаму казытаў нос. Жыццё праходзіць міма іх. Але ўсё роўна яна шчаслівая, пакуль жыве яе дзяўчынка. У дзіцяці ўвесь сэнс яе жыцця.

З-за паварота паказаўся аўтобус. Святлана заняла месца каля акна. У грудзях было неспакойна. Як там Каця? Хутчэй, хутчэй да яе.

На ўваходзе ў аддзяленне яе спынілі. Медсястра была катэгарычная.

— Жанчына, вы, напэўна, з глузду з'ехалі! Куды вы цягнеце гэтага мядзведзя? Вы ж самі ведаеце, якія тут хворыя! Да таго ж, такую старую і, пэўна, брудную цацку самы час на сметнік адправіць, а вы яе сюды прывезлі! Сорам у вас ёсць?

Святлана таксама не адступала, яна плакала, прасіла, маліла.

На шум выйшаў з ардынатарскай урач і дазволіў прапусціць Святлану. Страціўшы ўжо надзею, яна нават здзівілася. Іван Фёдаравіч быў вельмі строгі да рэжыму ў сваім аддзяленні і ніколі нікому не дазваляў яго парушаць. А тут раптам згадзіўся, дазволіў...

